ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Год выдання 37-ы
№ 11 (2280)
7 лютага 1969 г. ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

НА МОВАХ РОЗНЫХ НАРОДАЎ

У гэтыя дні ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя Леніна экспануецца выстаўка «Беларуская мастацкая літаратура на мовах народаў СССР і замежных мовах».

Тут можна ўбачыць творы нашых паэтаў і празаікаў на рускай, украінскай, казахскай, кіргізскай, азербайджанскай, армянскай, грузінскай, уйгурскай, адыгейскай і іншых мовах народаў СССР. Над перакладамі з беларускай мовы плённа працуюць вядомыя рускія пісьменнікі М. Ісакоўскі, А. Твардоўскі, А. Суркоў, А. Пракоф'еў, Я. Хялемскі, П. Кабзарэўскі, Я. Мазалькоў і многія іншыя майстры літаратурнага слова.

Творы Я. Купалы і Я. Коласа выдаваліся на рускай мове больш як сто разоў, тыражом звыш пяці мільёнаў экземпляраў. 50 разоў выдаваліся творы М. Танка агульным тыражом каля двух з палавінай мільёнаў экземпляраў. На рускай мове выйшла 27 кніг П. Броўкі тыражом адзін мільён 720 тысяч экземпляраў. А кнігі І. Шамякіна былі выдадзены па-руску 33 разы.

Асобнае месца на выстаўцы займаюць пераклады твораў нашых пісьменнікаў у зарубежных краінах. Там яны таксама займаюць дастойнае месца. Аб гэтым сведчаць томікі Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова, Я. Брыля, І. Мележа, І. Шамякіна, П. Панчанкі, В. Быкава і многіх іншых беларускіх пісьменнікаў на балгарскай, венгерскай, польскай, нямецкай, мангольскай, карэйскай, чэшскай, англійскай, французскай, іспанскай і многіх іншых мовах.



100

ТЭМАТЫЧНЫ КІНААГЛЯД

Падрыхтоўку да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна разгарнуў рэспубліканскі Палац культуры прафсаюзаў. Тут праводзяцца ленінскія чытанні, тэматычныя вечары, а гэтымі днямі адкрыўся тэматычны кінаагляд. Ён пачаўся тэмай «Ленін і Кастрычніцкая рэвалюцыя на кінаэкране».

Першы вечар агляду сабраў вялікую аўдыторыю — больш як 500 чалавек. Дэманстраваліся дакументальныя кадры з хранікальных кінафільмаў «Выстрал «Аўроры», «Жывы Ленін», «Рукапісы У. І. Леніна», а таксама фрагменты з мастацкіх кінафільмаў «Ленін у Кастрычніку», «Ленін у 1918 годзе», «Чалавек з ружжом», «Выбаргская старана».

Удзельнікі вечара сустрэліся з работнікамі беларускага кіно — рэжысёрам І. Шульманам, акцёрамі Н. Жукоўскай і У. Панячўным.

На бліжэйшы час у плане работы значацца такія тэмы, як «Вобраз У. І. Леніна і яго саратнікаў у кінамастацтве», «З партбілетам у руках і з Леніным у сэрцы», «Жыццём сваім прысягалі», «Пад марш стварэння — у светлае будучае» і іншыя.

СЕМІНАР КІРАЎНІКОЎ АРМЕЙСКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Палітычнае ўпраўленне Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі і Мінскі акруговы Дом афіцэраў правялі вучэбна-метадычны семінар кіраўнікоў самадзейных калектываў часцей і ваенна-навучальных устаноў акругі, прысвечаны падрыхтоўцы да ленінскага юбілею.

Удзельнікі семінара — хормайстры, балетмайстры, кіраўнікі духавых аркестраў і эстрадна-інструментальных ансамбляў праслухалі рад лекцый і дакладаў, прысутнічалі на занятках секцый па жанрах.

«Задачы армейскай мастацкай самадзейнасці ў сувязі з падрыхтоўкай да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» — гэтай тэме быў прысвечаны даклад начальніка адзела прапаганды і агітацыі Палітычнага ўпраўлення акругі палкоўніка А. Быкава.

Старшыня рэспубліканскай ваенна-шэфскай камісіі І. Герман расказаў пра вынікі ваенна-шэфскай работы тэатраў і канцэртных арганізацый рэспублікі ў часцях акругі за мінулы год.

Многа карыснага пачулі ўдзельнікі семінара на занятках секцый. Дацэнт кансерваторыі М. Маслаў пазнаёміў кіраўнікоў самадзейных харавых калектываў з новым рэпертуарам. Галоўны балетмайстар Белдзяржфілармоніі С. Гехт дапамог удзельнікам секцыі харэаграфіі развучыць некалькі новых масавых сцэнічных танцаў. Пра формы і метады работы з інструментальнымі калектывамі гаварыў дырыжор духавога аркестра штаба акругі Б. Чудакоў. Перад удзельнікамі секцыі мастацкага чытання выступіў артыст Белдзяржфілармоніі Р. Пятрэнка.

Удзельнікі семінара сустрэліся з дзеячамі мастацтва рэспублікі. Кампазітар Ю. Семяняка пазнаёміў армейскіх таварышаў са сваёй творчасцю. Спевакі А. Бокаў, Ю. Смірноў і М. Шаўчук выканалі творы кампазітара.

Я. МАЛЫ.

ДАРАГІЯ РЭЛІКВІІ

У Краснапольскай васьмігадовай школе, якая носіць імя былога вучня — Героя Савецкага Саюза Міхаіла Антонава, ужо некалькі гадоў працуе музей. Узначальвае яго работу настаўніца Б. Гардон. Большая частка экспазіцыі музея прысвечана жыццю і дзейнасці вялікага правадыра працоўных.

На стэндзе «Дзіцячыя і школьныя гады Ільіча» размешчаны фотаілюстрацыі, якія краязнаўцы атрымалі з Казанскага універсітэта. З Польскай Народнай Рэспублікі ў музей дасланы матэрыялы аб знаходжанні Уладзіміра Ільіча ў Польшчы. Цікавыя матэрыялы атрымалі школьнікі з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Адзін з іх расказвае пра помнік У. І. Леніну ў Айслебене.

Савет музея, у які ўваходзяць найбольш актыўныя краязнаўцы-вучні, падтрымлівае цесную сувязь з маскоўскімі скульптарамі, сваімі землякамі Нонай і Аляксандрам Грубэ. Скульптары падаравалі музею барэльеф правадыра і яго бюст.

Тут захоўваецца шмат прыгожа аформленых альбомаў, у якіх сабраны цікавыя матэрыялы аб жыцці і дзейнасці У. І. Леніна.

С. СЯМЁНАЎ.

У СЕЛЬСКАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ

У Пякарскай сельскай бібліятэцы Маладзечанскага раёна адбылася канферэнцыя чытачоў па рабоце Уладзіміра Ільіча «Задачы саюзаў моладзі». Яе ўдзельнікі з вялікай цікавасцю праслухалі ў грамзапісе прамову У. І. Леніна «Што такое Савецкая ўлада?»

Многа моладзі калгаса «Кастрычнік» прысутнічае на занятках ленінскіх урокаў. Апошні быў прысвечаны рабоце Уладзіміра Ільіча «Вялікі пачын». Да гэтых заняткаў бібліятэка падрыхтавала выстаўку кніг «Па запаветах Леніна». Бібліятэкарка Аляксандра Аноп адзін са сваіх бібліяграфічных аглядаў прысвяціла вобразу правадыра ў мастацкай літаратуры.

Л. САНДЛЕР.

ПЕСНЯ НАРАДЖАЕЦЦА Ў ЛІПЛЯНАХ



Вось яны, ліплянскія дзяўчаты з вакальнага ансамбля. Фота П. БЕЛАВУСА.

ЛІПЛЯНЫ — за сем кіламетраў ад Лельчыц. Гэта вялікае сяло, дзе шмат новых дамоў, шырокіх вуліц. Добра тут жывуць людзі.

Ліплянцы гавораць пра сябе: «Калі ты быў у нас і не пачуў нашых песень, значыць, ты не да канца ўведаў вёску, не людзей».

— Сапраўды, — усміхаецца загадчыца клуба Наташа Лось, — у Ліплянах спяваюць амаль усе — і старыя, і маладыя. Каб вы толькі паслухалі летнім вечарам, як звініць наша вёска ад песень!

Самыя галасістыя з ліплянскіх дзяўчат Наташа, Валя і Рая Лось, Ніна Варановіч, Ева Сечка, Валя Манько, Наташа Сідарэнка, Ліза Хільно. Яны пераняці ад сваіх бацькоў і песні, і манеру спяваць. А гады тры назад дзяўчаты надумалі стварыць вакальны ансамбль. Пачалі збірацца на спеўку ў клуб. Кіраваў імі спачатку самадзейны кампазітар Уладзімір Журовіч. Ён навучыў іх правільна спяваць, падабраў добры рэпертуар. Бо важна не толькі, як спяваць, але і што спяваць. Асновай рэпертуару склалі народныя песні і песні савецкіх кампазітараў. Спадабалася слухачам песня «Квітней, Палессе», якую напісаў У. Журовіч. Яна стала нібы пазыўным калектыву, яго маркай.

Сёння вакальны ансамбль з Ліплян — вядомы на ўсю рэспубліку, ён — лаўрэат Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады. З поспехам выступілі ліплянцы і ў час мінулагодняга агляду мастацкай самадзейнасці, прысвечанага 50-годдзю БССР і КПБ.

Зараз у рэпертуары спявачак каля паўсотні песень — лірычных, жартоўных, эпічных, абрадавых. Калектыў у штодзённых пошуках, у няспыннай творчай працы. Няма сумнення, што на гэтым шляху яго чакаюць новыя поспехі.

А. ШНЫПАРКОЎ.
Лельчыцкі раён.

УСЕСАЮЗНЫ АГЛЯД БІБЛІЯТЭК

У БІБЛІЯТЭЦЫ ЛАД, КАЛІ ПАЛІЦЫ—НЕ СКЛАД

Станіслава ЧЫБІСАВА,
загадчыца Пухавіцкай раённай бібліятэкі.

УЛАДЗІМІР ЗАКРЭЎСКІ — наш актыўны чытач. Гады тры назад ён скончыў сярэднюю школу і зараз працуе токарам у «Сельгастэхніцы». У яго абанементнай картцы каля двух дзесяткаў твораў Леніна, кніг аб паплечніках правадыра. Тое ж самае ў абанеменце маладой работніцы Леаніды Цвірко.

Неяк на днях зайшоў у бібліятэку пенсіянер Сідар Сцяпанавіч Кузьменка:

— Хачу прачытаць успаміны Крупскай аб Леніне. Па радыё ўчора перадавалі ўрывак. Надта ж цікава...

Такія просьбы мы чуем у гэтыя дні часта. Цяпер, як ніколі, адчуваецца, што ў народзе жыве нязгаснае жаданне раіцца з Леніным, вучыцца ў Леніна, працаваць і жыць, як Ленін. Жывы вобраз Ільіча кожны з нас носіць у сваім сэрцы. Ён у нашых справах, нашых думках, у нашых імкненнях.

Бібліятэкі — баявыя прапагандысты неўміручых ідэй Леніна. І наша высакародная задача — данесці яго творы да кожнага чытача, найбольш поўна і мэтанакіравана выкарыстаць кніжныя фонды.

Летась з творамі правадыра і кнігамі аб яго жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці пазнаёмілася больш дзвюх тысяч чытачоў сельскіх бібліятэк. Мы стараемся здзейсніць запавет Ільіча: бачыць гордасць і славу публічнай бібліятэкі не ў тым, колькі ў ёй рэдкасцей, а ў тым, як шырока абарачаюцца кнігі ў народзе, колькі прыцягнута новых чытачоў, як хутка задавальняецца любое патрабаванне на кнігу, колькі кніг раздадзена на рукі чытачам.

Бібліятэкі Пухавіцкага раёна актыўна ўключыліся ва Усесаюзны грамадскі агляд бібліятэк, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Рыхтавацца да стагоддзя з дня нараджэння Ільіча мы пачалі яшчэ да аб'яўлення агляду. Работнікі раённай і сельскіх бібліятэк актыўна прапагандавалі творы У. І. Леніна, кнігі аб родным краі, баявым шляху Кампартыі Беларусі. Работу гэту мы вялі на больш высокім ідэйным узроўні, чым раней, скарыстоўвалі разнастайныя формы і метады. Рыхтуючы тэматычныя вечары «Ленін — таварыш, чалавек», «Ленін і мастацтва», у чытальнай зале аформілі кніжныя выстаўкі, зрабілі альбом аб жыцці і дзейнасці Ільіча. У той час былі прачытаны па мясцовым радыё і на вечарах моладзі бібліяграфічныя агляды літаратуры аб Леніне.

Асаблівую ўвагу мы звяртаем на работу сярод моладзі, школьнікаў. Разам з райкомам камсамола арганізавалі два маладзёжныя клубы — «Равеснік» і «Юнацтва». Клубы правялі тэматычныя вечары «Стаялі насмерць камсамольцы», «Куды б мяне Айчына ні паслала», «Ты на подзвіг клічаш, камсамольскі білет». На гэтых вечарах моладзь сустракалася з воінамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, перадавікамі вытворчасці — маладымі героямі нашых дзён. У сярэдніх школах былі праведзены чытацкія канферэнцыі па творы Леніна «Задачы саюзаў моладзі» і літаратурна-мастацкі вечар «Вечна жывы».

У камуністычным выхаванні падрастаючага пакалення важную ролю адыгрывае ваенна-патрыятычная літаратура. Для прапаганды яе мы выкарыстоўваем усе формы і метады бібліятэчнай работы: індывідуальныя гутаркі, кніжныя выстаўкі, бібліяграфічныя агляды, сустрэчы з Героямі Савецкага Саюза, былымі партызанамі. Цікавыя гутаркі праводзіць наш чытач, афіцэр запасу Андронаў. Нядаўна па мясцовым радыё зрабіла агляд літаратуры на тэму «У жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу» загадчыца чытальнай залы Р. Пагірніцкая.

Пра эфектыўнасць нашай работы сведчаць факты. Намнога павялічылася колькасць кнігавыдач грамадска-палітычнай літаратуры. Узрос попыт на мастацкую літаратуру пра Ільіча, асабліва на такія кнігі, як «Апавяданні пра Леніна» С. Антонава, «Сіні сшытак» Э. Казакевіча, трылогія М. Пагодзіна аб Леніне, зборнік «Вечна жывы».

У нашым раёне 26 сельскіх бібліятэк і 13 прыклубных. Многія з іх таксама праводзяць цікавую індывідуальную і масавую работу сярод чытачоў. Умела і мэтанакіравана прапагандуе творы Леніна Скрыль-Слабадская сельская бібліятэка, якой кіруе З. Мазанік. Да розных груп чытачоў тут свой падыход. Калгаснікам Зінаіда Іванаўна, у першую чаргу, рэкамендуе творы М. Горкага, У. Маякоўскага, Э. Казакевіча аб Леніне, а таксама кнігі аб паплечніках Ільіча. Для іх жа два разы ў месяц у сельскай бібліятэцы і бібліятэках-перасоўках праводзяцца ленінскія чытанні на тэмы: «Ленін — правадыр нашай рэвалюцыі», «Вялікі, блізкі і просты», «Працаваць па-камуністычнаму, як вучыў У. І. Ленін».

...У зале цішыня. Раптам з дынаміка загучаў голас Ільіча. Уважліва слухалі хлебаробы жывыя словы правадыра аб тым, што такое Савецкая ўлада. А потым з жыхарамі беларускага сяла гутарылі Крупская, Стасава, Яраслаўскі, Бонч-Бруевіч, Калінін — іх успаміны таксама прагучалі ў запісе. Пасля пачулася музыка — творы, якія любіў Ленін. Так прайшоў адзін з вечароў у Скрыль-Слабадской бібліятэцы, і ён нікога не пакінуў раўнадушным, запомніўся назаўсёды. Не менш цікава прайшла канферэнцыя чытачоў «Вобраз У. І. Леніна ў літаратуры».

У бібліятэцы афармляецца штомесячны стэнд-каляндар. Ён паведамляе аб тым, калі і якія творы былі напісаны Леніным, у сувязі з якімі падзеямі. Побач на паліцах размешчаны гэтыя кнігі, і людзі ахвотна бяруць іх чытаць. Тут жа, на палічцы альбом водгукаў аб творах Ільіча.

Кожную нядзелю людна бывае ў Талькаўскай бібліятэцы. Сюды збіраюцца мясцовыя жыхары, каб паслухаць чарговую кнігу пра Леніна. Чытае іх загадчыца бібліятэкі Таццяна Антонаўна Кандрацьева. За мінулы год кнігавыдача твораў Леніна склала тут 678 экземпляраў. Для лепшай прапаганды ленінскай спадчыны ў бібліятэцы аформлены стэнд «Ленін з намі — ён заўсёды жывы», побач — маляўнічыя плакаты «Будзьце дастойнымі ленінцамі», «З намі Ленін». Вялікую дапамогу работнікам бібліятэкі аказвае партыйная арганізацыя, інтэлігенцыя сяла, асабліва настаўніцы А. Баешка, М. Траццяковіч, І. Барысенка.

Ленінскія чытанні, тэматычныя вечары, прысвечаныя вялікаму правадыру, праводзяцца ў Дукорскай, Цітвянскай, Ананіцкай і іншых сельскіх бібліятэках. У многіх наладжваюцца тэматычныя вечары «Квітней, мой родны край», «Радзіма, мая дарагая», вечары пытанняў і адказаў на тэмы: «Ці ведаеш ты свой родны край?», «Сельсавет, у якім мы жывём», сустрэчы са старымі бальшавікамі, ветэранамі працы. І кожная бібліятэка робіць усё па-свойму, уносіць штосьці адметнае.

Раённая бібліятэка разам з аддзелам культуры арганізавалі эстафету пад дэвізам «Па ленінскіх запаветах мы будуем камунізм». Для эстафеты падрыхтавалі спецыяльны альбом. На яго старонках усе бібліятэкі раскажуць аб вопыце прапаганды твораў Леніна і літаратуры аб ім. Гэтая эстафета дапамагае нам сабраць і шырэй скарыстаць вопыт, які накапілі культасветустановы ў час падрыхтоўкі да юбілею Беларусі і ў першыя месяцы агляду.

Тое, што мы зрабілі — гэта толькі пачатак. Наперадзе вялікая і напружаная работа, шмат цікавых задум. Запланаваны ў нас вечары «Сэрцы, аддадзеныя рэвалюцыі» (аб паплечніках Леніна), «Кавалеры ордэна Леніна», літаратурна-музычны вечар «Этапы вялікага шляху». Карацей кажучы, планы ёмкія, грунтоўныя.

Вядома, ёсць у нас нямала цяжкасцей. Асабліва перашкаджае тое, што дзве трэці бібліятэчных работнікаў не маюць спецыяльнай адукацыі. А бібліятэкар — душа справы, пісала Н. К. Крупская. Ён не можа быць простым тэхнічным выдавальшчыкам кніг... Надзежда Канстанцінаўна назвала савецкую масавую бібліятэку «жывым культурным цэнтрам», а гэта патрабуе ад бібліятэкара ўмення падыходзіць да масы, працаваць з масай, ведаць яе запатрабаванні, умення накіроўваць яе інтарэсы ў пэўнае рэчышча, будзіць самадзейнасць чытачоў...

Так, бібліятэкар павінен шмат ведаць, быць высокаадукаваным чалавекам. Каб гаварыць з чытачом аб творах Леніна, бібліятэкару трэба самому іх добрасумленна вывучыць. Работнікі раённай бібліятэкі ўжо прапштудзіравалі працы Леніна аб Кастрычніцкай рэвалюцыі. Цяпер вывучаюць працы Леніна аб літаратуры і мастацтве.

Раённая бібліятэка — гэта метадычны цэнтр для сельскіх устаноў культуры. Вось чаму мы запланавалі для работнікаў сельскіх бібліятэк трохдзённыя семінары, рыхтуем дакладчыкаў, праводзім практычныя заняткі. Склалі графік выездаў у сельскія бібліятэкі, думаем правесці ў раёне практычныя канферэнцыі «У. І. Ленін аб развіцці бібліятэчнай справы ў краіне», «Роля бібліятэкі і кнігі ў выхаванні дзяцей на прыкладах жыцця і дзейнасці правадыра». Для аказання метадычнай дапамогі сельскім установам культуры прыцягваем таксама Рудзенскую гарадскую бібліятэку, а таксама Талькаўскую і Скрыль-Слабадскую сельскія. Работнікі іх ахвотна дзеляцца вопытам з калегамі.

Вось такія нашы справы. Паўтараю, тое, што мы зрабілі, — гэта толькі пачатак. Наперадзе напружаная праца па прапагандзе неўміручых ідэй Леніна.

ПЛАНЫ, ЗАДУМЫ, СПРАВЫ

Расказвае старшыня праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання народная артыстка СССР Л. П. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ.

Актыў нашага аб'яднання разам з супрацоўнікамі Міністэрства культуры БССР прагледзеў усе спектаклі тэатраў рэспублікі, прысвечаныя 50-годдзю БССР і КПБ. Адбыліся абмеркаванні гэтых прэм'ер. У іх удзельнічалі вядучыя майстры беларускай сцэны, мастацтвазнаўцы і тэатральныя крытыкі Мінска і Масквы. Хутка будуць названы лепшыя з гэтых спектакляў, якія потым убачыць мінскі глядач.

З Мінска па гарадах рэспублікі выпраўляецца вялікая выстаўка «Тэатры рэспублікі ў гады Савецкай улады».

Гэта некалькі ўжо выкананых мерапрыемстваў з плана работы праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання на 1969 год.

У канцы лютага ў Ленінградзе, у Палацы мастацтваў імя К. С. Станіслаўскага адбудзецца Дзень Беларусі, у якім прымуць удзел майстры тэатра імя Якуба Коласа, салісты опернага тэатра, філармоніі і кансерваторская моладзь. Другога сакавіка такі ж дзень адбудзецца ў Маскве, у Доме акцёра імя А. А. Яблачкінай. Ён пачнецца заняткамі народнага універсітэта пры Усерасійскім тэатральным аб'яднанні — доктар мастацтвазнаўства У. Няфёд прачытае слухачам універсітэта лекцыю «Беларускі тэатр сёння». Нашы артысты сустрэнуцца з майстрамі маскоўскіх тэатраў, пабываюць у гасцях у калектыву завода імя У. І. Леніна.

Рыхтуючыся да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча, аб'яднанне распрацавала падрабязны план мерапрыемстваў. Мяркуем правесці фестываль лепшых спектакляў на ленінскую тэму. Каб арганізаваць яго лепш, камандзіруем рэжысёраў, мастакоў і тых акцёраў, якія працуюць над вобразам правадыра, у Маскву і Ленінград. Яны пабываюць там, дзе жыў і працаваў Ільіч, пазнаёмяцца з архіўнымі матэрыяламі, будуць займацца ў тэатральных бібліятэках, вывучаць вопыт савецкай сцэнічнай Лeнініяны.

Ужо цяпер тэатразнаўцы рэспублікі рыхтуюцца да тэарэтычнай канферэнцыі, у якой прыме ўдзел і Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, — на ёй будуць абмеркаваны праблемы сцэнічнага ўвасаблення вобраза У. І. Леніна на беларускай сцэне.

«Беларуская Лeнініяна» — так называецца зборнік, куды ўвойдуць артыкулы пра работу нашых дзеячоў сцэны над гісторыка-рэвалюцыйным рэпертуарам, нарысы і ўспаміны, а таксама здымкі са спектакляў, эскізы афармлення. Гэта вельмі адказнае выданне, і наш актыў будзе намагацца зрабіць яго як мага больш змястоўным і цікавым.

Чытачы газеты «Літаратура і мастацтва» ведаюць, што пры БТА стала дзейнічае лекторый. У 1969—70 навучальным годзе ў яго праграме галоўнае месца зоймуць такія тэмы, як «Ленін і мастацтва», «Вобраз правадыра на сцэне», «Праблемы рэжысёрскага і акцёрскага майстэрства ў рабоце над ленінскай тэмай» і да т. п.

Практыка паказала, што выязныя пасяджэнні прэзідыума БТА ў тэатрах аказваюць плённы ўплыў на творчую дзейнасць гэтых калектываў. Напярэдадні юбілею мы наладзім такія пасяджэнні ў Магілёўскім абласным тэатры і Брэсцкім тэатры імя Ленінскага камсамола Беларусі.

Сталы клопат аб'яднання — творчасць народных тэатраў і самадзейных калектываў. Нядаўна наш актыў пазнаёміўся са спектаклямі, што былі пастаўлены артыстамі-аматарамі да 50-годдзя БССР і КПБ, і падрабязна іх абмеркаваў. Цяпер мы наладжваем семінар кіраўнікоў народных тэатраў і самадзейных калектываў, дзе будзем вывучаць надзённыя патрэбы, рэпертуарныя планы і творчыя намеры рэжысёраў гэтых калектываў. Справа ў тым, што вобраз Леніна — праца, якая вымагае не толькі энтузіязму, а і ўдумлівай, патрабавальнай работы. Асабліва строга трэба падыходзіць да яе на самадзейнай сцэне.

Як бачыце, нават кароткі пералік некаторых мерапрыемстваў, якія Беларускае тэатральнае аб'яднанне праводзіць разам з Міністэрствам культуры БССР, сведчыць пра інтэнсіўнасць дзейнасці нашага актыву і ўсіх арганізацый — у Мінску і ў абласных цэнтрах.

■ ■ ■

Адбылося пасяджэнне праўлення Саюза кампазітараў БССР, на якім зацверджаны план работы кампазітарскай арганізацыі на 1969 год. Праз год уся наша краіна, усё чалавецтва будзе адзначаць стогадовую гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна. Таму, натуральна, што асноўнае месца ў плане адведзена мерапрыемствам, звязаным з гэтай знамянальнай датай.

Беларускія кампазітары прымуць удзел у рэспубліканскім конкурсе на лепшую песню, прысвечаную У. І. Леніну, Радзіме, партыі, які будзе праводзіцца Міністэрствам культуры БССР сумесна з саюзамі пісьменнікаў і кампазітараў Беларусі. Намячаецца таксама правесці конкурсы музычных самадзейных калектываў і салістаў на лепшае выкананне твораў, прысвечаных Ільічу.

У час дзён беларускай культуры, якія намячаецца правесці на радзіме У. І. Леніна ва Ульянаўску, выступіць канцэртная брыгада Саюза кампазітараў. Кампазітары і выканаўцы раскажуць працоўным аб дасягненнях беларускай музыкі, выканаюць лепшыя творы беларускіх аўтараў.

Другая брыгада будзе выязджаць у гарады, раённыя цэнтры, калгасы з новымі творамі беларускіх кампазітараў. Музыказнаўцы прачытаюць серыю лекцый аб беларускай музычнай Лeнініяне, аб дасягненнях і росквіце беларускай музыкі за гады Савецкай улады.

Саюз кампазітараў плануе арганізаваць рад канцэртаў, прысвечаных юбілейнай даце, для воінаў Савецкай Арміі, для школьнікаў. У канцэртах будуць заняты лепшыя музычныя калектывы рэспублікі.

Пасля пасяджэння наш карэспандэнт гутарыў з некаторымі беларускімі кампазітарамі. Яны расказалі аб сваіх планах, задумах...

Старэйшы кампазітар М. Аладаў закончыў сімфанічную паэму «Народ і правадыр», прысвечаную палымянаму змагару рэвалюцыі.

Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР прыняла для выканання новую рэдакцыю кантаты А. Багатырова «Леніну слава».

У творчым партфелі Ю. Семянякі — новая песня «Паклон Ільічу» (словы П. Прыходзькі). Зусім нядаўна ён закончыў новую рэдакцыю «Песні аб вялікім чалавеку» (на словы літоўскага паэта Т. Цілвіціса). У планах кампазітара — стварэнне новых песень на словы А. Бачылы і іншых беларускіх паэтаў.

Малады кампазітар І. Лучанок працуе над цыклам песень аб Леніне і партыі. Дзве песні з цыкла — «Хадакі» (на словы М. Алтухова) і «Апасіяната» (словы Э. Агняцвет) ужо напісаны. Кампазітар падабраў яшчэ некалькі тэкстаў для далейшай работы над песнямі.

У планах І. Кузняцова — кантата, прысвечаная правадыру і партыі, а таксама цыкл хораў на словы А. Астрэйкі, П. Глебкі і іншых беларускіх паэтаў.

Г. Вагнер піша вялікі хор, а ў перспектыве — работа над Маналогам пра Леніна (для барытона і сімфанічнага аркестра).

Над новым вакальным творам да знамянальнай даты працуе Л. Абеліёвіч.

Я. Цікоцкі завяршае манументальную працу — оперу «Заранка» («Ганна Громава») па лібрэта Я. Рамановіча. Падзеі оперы ахопліваюць перыяд з 1914 па 1920 гады і расказваюць аб рэвалюцыйнай барацьбе і станаўленні Савецкай улады ў Беларусі.

Э. Тырманд пачынае работу над буйным камерным творам — санатай для фартэпіяна. Тэма рэвалюцыі, вобраз правадыра зоймуць месца ў хорах і вакальных творах, над якімі кампазітар збіраецца працаваць сёлета.

ТРЭЦЯЯ СУСТРЭЧА

ПАЗАЎЧОРА спектаклем «Спявае «Жаваранак» у Мінскім акруговым Доме афіцэраў пачаў свае гастролі Магілёўскі абласны тэатр музычнай камедыі.

У гутарцы з нашым карэспандэнтам дырэктар тэатра А. Паніхін расказаў:

— Гастролі ў Мінску — вялікая падзея для ўсяго калектыву тэатра. Гэта наш трэці прыезд у сталіцу рэспублікі. За час гастроляў — 24 дні — мы пакажам 26 музычных спектакляў. Акрамя гэтага, зробім выезды ў Барысаў, Слуцк, Дзяржынск, Стаўбцы і іншыя гарады Мінскай вобласці.

Наш тэатр выступае пасля таго, як тут, у Мінску, пабывалі цікавыя калектывы музычнай камедыі на чале з Маскоўскім тэатрам. Мы, зразумела, хвалюемся, ці ўдасца нам заваяваць прыхільнасць патрабавальнага гледача, і прымаем усе захады, каб не расчараваць аматараў вясёлага жанру.

Аперэта — жанр вясёлы, а гэта вымагае ад калектыву, каб на кожным прадстаўленні адразу ж, як адкрыецца заслона, на сцэне панаваў імклівы рытм, а ў ігры акцёраў была б імправізацыйная лёгкасць, што так прываблівае гледача. Але ўсе сродкі падначальваюцца ідэйна-мастацкай задуме спектакля — для нас галоўны клопат у тым, каб паказаць змястоўнае відовішча з цікавым сюжэтам, яркімі характарамі, добрай музыкай і віртуознымі танцамі. Мяркуючы па нашых гастролях на Украіне і ў Прыбалтыцы, па газетных рэцэнзіях і водгуках гледачоў, нашаму тэатру ўдаецца дасягнуць паўнага творчага поспеху.

Рэпертуар у нас даволі разнастайны: і класічная аперэта, і сучасная музычная камедыя. Вядзём мы творчы пошук у жанры гераічнага спектакля. Адным словам, мінчанам ёсць што выбраць з нашай афішы. Імёны кампазітара, назвы твораў спыняюць увагу, нешта нагадваюць, а то і ўвогуле абяцаюць знаёмства з новым арыгінальным творам...

Мінчане і госці сталіцы змогуць паглядзець гераічную музычную камедыю А. Сандлера «На досвітку», аперэты «Дзяўчына з блакітнымі вачамі» В. Мурадэлі, «Чорны дракон» Д. Мадуньё, «Цыганскае каханне» і «Вясёлая ўдава» Ф. Легара, «Лятучая мыш» І. Штрауса, «Сільва», «Прынцэса цырка» І. Кальмана.

Свае гастролі мы адкрылі гераічнай музычнай камедыяй у трох дзеях «Спявае жаваранак». І гэта не выпадкова. Гэтую п'есу напісала артыстка нашага тэатра Н. Калаптур. Музыку стварыў беларускі кампазітар Ю. Семяняка. Выбар гэтай п'есы невыпадковы. Яна ўпершыню сродкамі і формамі музычнага камедыйнага жанру расказвае аб гераічнай барацьбе партызан-падпольшчыкаў і савецкіх разведчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

У нашых спектаклях заняты заслужаныя артысты БССР Д. Іванова, В. Шаўкалюк, Г. Лаўроў, заслужаная артыстка РСФСР Н. Рэвінская, вядучыя салісты В. Герасімава, Н. Калаптур, Ф. Краўцоў, П. Масцераў, вядучыя салісты балета Г. Чарвякова, А. Кастрыцкі, артысты Г. Падароўская, І. Мароз, Г. Скавіціна і многія іншыя. Усе пастаноўкі тэатра ажыццёўлены галоўным рэжысёрам заслужаным артыстам Карэльскай АССР Уладзімірам Ажарэльевым пры ўдзеле галоўнага дырыжора тэатра Уладзіміра Шастапалава і маладога балетмайстра-пастаноўшчыка Юрыя Волкава.

— З вопыту мінулых гадоў, — сказаў у заключэнне Анатоль Іванавіч Паніхін, — мы ведаем, як цёпла і сардэчна прымаюць нас мінчане. У сваіх надзеях мы не памыліліся і на гэты раз. Наш першы спектакль «Спявае «Жаваранак» прайшоў з поспехам. Спадзяемся, што і далей мы апраўдаем надзеі нашых гледачоў.

Сардэчна запрашаем, дарагія мінчане, у наш тэатр!



Сцэна са спектакля Магілёўскага абласнога тэара музычнай камедыі «Спявае жаваранак».

Фота Ул. КРУКА.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

Першай прэм'ерай гэтага года стаў спектакль Рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага—дакументальная хроніка «Руіны страляюць ва ўпор», напісаная паводле вядомай кнігі І. Новікава. Аўтары сцэнічнай апрацоўкі — пісьменнік І. Новікаў і рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Казахскай ССР і заслужаны артыст КАССР М. Сулімаў. Мастацкае афармленне заслужанага дзеяча мастацтваў БССР А. Грыгар'янца. Музыку напісаў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Г. Вагнер.

На здымку — сцэна са спектакля «Руіны страляюць ва ўпор».

Фота Ул. КРУКА.



ЮБІЛЕЙНАЯ МАСТАЦКАЯ

ГРАНІ ВЯЛІКАЙ ТЭМЫ

Вайна даўно адгрымела. І вайна працягвае хваляваць. Адгукаецца болем у ранах людзей, маладосць якіх хадзіла яе цяжкімі дарогамі ў вайсковым шынялі. Урываецца жахам у сны салдацкіх матак і ўдоў. Свеціцца гонарам у вачах дзяцей, калі слухаюць яны расказы старэйшых або сцежкамі чырвоных следапытаў ідуць па месцах былых баёў і подзвігаў.

Вайна працягвае хваляваць мастакоў. Хваляваць і натхняць. І чым далей па часе мы ад яе адыходзім, тым маштабней, глыбей адкрываюцца нам вытокі яе героікі, тым ясней акрэсліваецца галоўнае ў невычарпальнай тэме «чалавек на вайне». Часам тое, што ў першыя пасляваенныя гады па свежых уражаннях здавалася другарадным, выходзіць на першы план, і наадварот—тое, што тады здавалася галоўным, сёння ўяўляецца толькі фонам.

Вайна працягвае хваляваць. Але ніколі не дасягне поспеху мастак, які разлічвае толькі на гэтую, гаворачы тэатральнай мовай, «самайгральнасць» тэмы. У лепшым разе ён створыць больш-менш удалую ілюстрацыю. Па-сапраўднаму ж усхвалюе гледача, западзе яму ў сэрца, выкліча роздум толькі тая работа, якая, расказваючы пра дзень мінулы, закранае *праблемы і трывогі дня сённяшняга*, якая, грунтуючыся на ўсенародным подзвігу ў мінулую вайну, з дапамогай багатага духоўнага мастакоўскага вопыту па-новаму ўзнімае вечную тэму чалавечага хараства, чалавечай высакароднасці.

На выстаўцы, пра якую ідзе тут гаворка, сярод твораў пра подзвіг народа ў гады Вялікай Айчыннай выдзяляюцца дзве работы мастакоў, чыя творчасць у пэўнай меры вызначае высокі прафесіянальны і эстэтычны ўзровень і філасофскую глыбіню, дасягнутыя беларускімі жывапісцамі ў апошнія гады.

Вялікае палатно «Пакаранне смерцю» М. Савіцкага адразу прыцягвае ўвагу незвычайнасцю колернага і кампазіцыйнага вырашэння. Твор — пра самаахвярнасць савецкіх людзей у суровай барацьбе з ворагам.

...У адну з чароўных летніх начэй, якія так уражваюць у нас у Беларусі, калі здаецца, нібы ўвесь свет—у спакойным сне (а менавіта такую ноч перадае мастак—быццам і няма нідзе ніякай вайны), у адной з беларускіх вёсак фашысты вывелі на пакаранне смерцю партызанскую сям'ю. Вось яны стаяць, пяцёра. *Маладая жанчына, якая чакае* дзіця, (яна трымае рукі на жываце, нібы ахоўвае жыццё, якому так і не суджана з'явіцца на свет, і ад гэтага яшчэ страшней паказаная мастаком трагедыя). Побач з жанчынай—мужчына сярэдняга веку. Моцна сціты яго губы, ля рота—валявая складка, а погляд звернуты некуды ўнутр... У цэнтры ўсёй *групы—самы старэйшы, пасярэ*браны сівізной. Адчуваецца, што ён многае пабачыў і паспытаў на вяку. Менавіта на яго, хто як бы ўвасабляе сэнс жыцця і барацьбы, надзелі фашысты дошку з надпісам «Партызаны»... Тут жа і зусім яшчэ падлетак...

У карціне ўсё поўна сэнсу, усё значнае, сімвалічнае.

Высокі псіхалагічны напал падзеі—момант найвышэйшага ўнутранага чалавечага напружання.

Кампазіцыя падпарадкавана задуме. Фігуры—статычныя. Позы—унутрана ўраўнаважаныя. І франтальны разварот усіх фігур асацыіруецца з помнікам, манументам, з вечным, несмяротным, з тым, што застаецца ў *памяці народнай назаў*жды. А па канстрасце—неўраўнаважаны, пазбаўлены лінейнай перспектывы і перспектывы святла і паветра другі план.

Усе мае значэнне ў карціне—і высакародны спакой людзей у момант апошняга выпрабавання, і трывожныя фарбы паветра, і белая бярозка, і купы дрэў на другім плане.

Колер падпарадкаваны кампазіцыі. Прыглушаныя цёмназялёныя, цёмна-сінія, цеплавата-карычневыя фарбы другога плану супрацьпастаўлены яркім, амаль адкрытым лакальным колерам любімых М. Савіцкім фарбаў — жоўтых, сініх, белых, чырвоных. Яны гучаць у гэтай карціне магутнымі акордамі сімфанічнага аркестра. Надзвычайная музычнасць колеру!..

З новай для сябе тэмай Беларусі-партызанкі вось ужо другі раз выступае М. Данцыг. «Партызанскае вяселле». Палымяная рамантычная паэма пра ўсенародную цяжкую барацьбу і пра вечнасць і неадольнасць кахання.

Цэнтр складанай шматфігурнай кампазіцыі—пара маладажонаў, якая праходзіць уздоўж шчыльнага строю партызан. У тым, як юнак і дзяўчына сціскаюць баявую зброю, у тым, якой рашучасці поўныя іх адухоўленыя, яшчэ зусім юныя твары, мы адчуваем і разумеем, што цяпер, у гэты вельмі важны і адказны для іх момант, яны даюць клятву вернасці не толькі адзін аднаму, але і Радзіме.

Як і належыць на вяселлі, гарманіст расцягнуў на ўвесь мех гармонік. Сват падперазаны ручніком. Заўжды цікаўныя да ўсяго малыя. Але тут жа—*ствалы дрэў, баявыя вінтоўкі і аўта*маты. А на тварах не толькі адчуванне ўрачыстасці моманту, але і трывога. Як заўтра складзецца лёс маладажонаў і іх баявых сяброў? І рукі мацней сціскаюць зброю...

М. Данцыгу заўсёды былі ўласцівыя выразная, упэўненая і энергічная лінія, моцны размашысты мазок, скульптурная леп*ка аб'ёмаў, матэрыяльнасць*. Цяпер, у спалучэнні з яснай і глыбокай філасофскай думкай, з павышаным псіхалагізмам у распрацоўцы характараў і ў колерным вырашэнні гэтыя рысы яго таленту набылі новае якаснае гучанне.

Можна сказаць, што ў творчасці М. Данцыга таксама з'явіўся вобраз мадонны. Але яго мадонна адрозніваецца ад мадон М. Савіцкага. У М. Данцыга, як і ўсе яго героі, яна больш зямная.

Глыбіня мастакоўскага мыслення і здольнасць да значных абагульненняў шмат у чым родняць розныя па творчых почырках новыя творы М. Савіцкага і М. Данцыга.

На гэтай выстаўцы мы бачым і творы, аўтары якіх не здолелі ўзняцца да тае ступені абагульнення, эмацыянальнай напоўненасці вобразаў, пра якіх можна з упэўненасцю сказаць, што мастак вядзе сур'ёзную гаворку з гледачом.

Н. Воранаў, мастак, які даўно ўжо выпрацаваў уласную, аднаму яму ўласцівую жывапісную манеру, да тэмы Вялікай Айчыннай вайны, непасрэдным удзельнікам якой ён быў, звяртаецца даволі рэдка. Помніцца, што толькі ў сценах Акадэміі мастацтваў ён напісаў некалі дыпломную работу «Рэйд Каўпака». Таму можна зразумець асаблівую цікавасць гледача да яго карціны «Салдаты», паказанай на юбілейнай выстаўцы.

...Трывожная зімовая франтавая ноч. Асвятляльная ракета на нейкае імгненне вырвала з цемры акоп поўнага профілю. У ім упокат—хто як і дзе—у неспакойным і нетрывалым сне забыліся салдаты. Асветлены ракетай і варожы бок лініі фронту, за якім уважліва сочыць назіральнік. Цішыня. Гэта, мабыць, адзін з тых момантаў, пра якія ў зводках Савецкага інфармбюро ў часе вайны паведамлялася, што на такім-та участку фронту—без перамен.

На жаль, у палатне не адчуваецца акрыленасці, сімвалічнасці, высокай ступені абагульнення, што ўласціва лепшым карцінам Н. Воранава. Параўноўваеш гэтую карціну з «Рэйдам Каўпака», і пераконваешся, што параўнанне—у карысць даўняга твора, хоць і культура жывапісу ў мастака несумненна вырасла.

Гэткая ж, як і ў Н. Воранава, «жывапісная дакументальная фатаграфія», павярхоўная рэгістрацыя эпізодаў вайны без належнага іх мастакоўскага асэнсавання—у карцінах У. Пасюкевіча «Абаронцы Брэсцкай крэпасці», І. Ціханава «Пад чырвоным сцягам збіраўся народ», Я. Зайцава «Камсамольскае падполле», І. Стасевіча «Май. 1945 год». Аўтарам не ўдалося раскрыць складанасць, шматграннасць унутранага свету савецкага чалавека на вайне. Пошукі новага, паглыбленага зместу пры вырашэнні адной з вядучых тэм савецкага мастацтва падмяняюцца варыяцыямі ўжо не аднойчы бачанага гледачамі і ў творчасці саміх аўтараў гэтых твораў, і ў работах іх калег.

Так, на мой погляд, «Камсамольскае падполле» Я. Зайцава з'яўляецца адной з варыяцый матываў паказанага гэтым мастаком на мінулай рэспубліканскай выстаўцы трыпціха пра Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Некалі карціна І. Стасевіча «У партызанскіх балотах» была пэўным адкрыццём. Ледзь ці не ўпершыню прагучаў у ім вобраз «партызанскай мадонны». У карціне «Май. 1945 год» таксама можна было неяк па-новаму, па-сённяшняму расказаць пра «сына палка», раскрыць высакароднасць чалавечага подзвігу тых, што дайшлі да варожага логава. Гэтыя магчымасці, на жаль, засталіся нерэалізаванымі. Ствараецца ўражанне, што аўтара больш цікавілі чыста жывапісныя якасці карціны ва ўрон яе зместу.

Пошук новых форм, новых выяўленчых сродкаў—працэс цяжкі і складаны. Новая форма павінна абавязкова дыктавацца новым зместам. Калі ж форма цікавіць мастака сама па сабе, а не прадыктавана зместам, яго наўрад ці напаткае ўдача. Паказаная на гэтай выстаўцы карціна А. Малішэўскага «Маці партызанская»—яшчэ адзін прыклад гэтаму.

У пошуках большай выразнасці, у пошуках шляхоў завастрэння характараў пайшоў В. Грамыка на новую аўтарскую інтэрпрэтацыю свайго твора «Да апошняга патрона», напісанага гадоў шэсць—сем назад. Новы варыянт называецца «Балада пра апошнюю кулю».

Калі ў рабоце «Да апошняга патрона» мастак ішоў традыцыйным шляхам пленэрнага жывапісу, дык у новым палатне, пакідаючы без змен цэнтральную групу (у гэтым, уласна, вядучы пралік мастака), ён адмаўляецца ад лінейнай і паветранай перспектывы. Не мяняючы кампазіцыі ў цэлым, пакідаючы нават *ранейшыя памеры* карціны, ён рэзка мяняе ўсю каларыстычную гаму, будуючы яе на рэзкім кантрасце чорнага і чырвонага, што, на думку мастака, павінна выклікаць асацыяцыі з гукамі жалобнага маршу, навесці гледача на роздум пра веліч смерці ў імя жыцця. Але каб твор загучаў па-новаму, мне здаецца, недастаткова, змяніць *толькі колерны лад карціны*.

Калі ў М. Савіцкага адмаўленне ад лінейнай і паветранай перспектывы апраўдана і задумай, і ўсім кампазіцыйным і колерным ладам твора, дык у В. Грамыкі ўсё, што засталося пасля такога адмаўлення, як бы павісае ў паветры—на шкоду глыбіні эмацыянальнага зместу.

Адмаўляючыся ад традыцый*ных прыёмаў у жывапісе*, мастак мусіць памятаць, што на змену ім павінны прыйсці яшчэ больш дакладная, прадуманая, выразная, толькі да гэтага твора падыходзячая лінія. Павінна прыйсці яркая, эмацыянальна насычаная колерная пляма, якой у адпаведнасці з няўмольнымі законамі гармоніі мастак мусіць знайсці дакладнае і пэўнае месца, *узятае ў той колернай сіле* або ганальнасці і ў тых суадносінах з іншымі кампанентамі, карціны, якія ў сукупнасці памаглі б яму паўней раскрыць задуму, змест твора. І, нарэшце, павінен прыйсці да тонкасцей прадуманы лінейны і колерны рытм. Вось той трывалы сплаў, які, на жаль, аказаўся парушаны ў В. Грамыкі на шкоду цікавай задуме.

Год будзе ісці за годам, а подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне па-ранейшаму застанецца невычэрпнай крыніцай творчага натхнення. Усё новыя і новыя пакаленні мастакоў стануць прысвячаць яму свае карціны. І вялікае шчасце для мастака — знайсці ў гэтым расказе сваю грань, адкрыць неадкрытае, расказаць так, як яшчэ ніхто да яго не расказваў.

Валерый ВАЛЬФОЎСКІ.

ПА СЛЯДАХ ГЕРОЯЎ

Пагранічны атрад, дзе служыў Андрэй Кіжаватаў, пазней Герой Савецкага Саюза, у грозным 1941 годзе прыняў на сябе першыя ўдары ворага. Пры абароне крэпасці над Бугам як гераіня праявіла сябе і дачка Кіжаватава Нюра. Тут геройскай смерцю загінуў яе бацька, чыё імя носіць *цяпер адна з застаў*.

Аб усім гэтым былы ўдзельнік абароны Брэсцкай крэпасці, цяпер пісьменнік А. Махнач, расказаў вучням і настаўнікам Цімкавіцкай школы ў час сваёй сустрэчы з імі. Вось тады і ўзнікла думка—паставіць спектакль па п'есе А. Махнача «Гаўрошы Брэсцкай крэпасці», дзе дзейнічае і іх былая вучаніца Нюра Кіжаватава.

У ролі Кіжаватава заняты артыст мясцовага народнага тэатра І. Аляксандраў, у ролі Патаповіча — Н. Жагло, яфрэйтара іграе А. Дубовік, парламенцёра — А. Семяновіч. Дзіцячыя ролі выконваюць школьнікі: Нюра — вучаніца 9 класа Вера Кажанава, Пеця Клыпа — вучань 8 класа Мікалай Іваноў. У спектаклі заняты і іншыя вучні дзіцячай студыі пры народным тэатры.

Развучванне п'есы захапіла ўсіх — і дзяцей, і дарослых. І цяпер у школе ствараецца музей аб слаўных абаронцах Брэсцкай крэпасці, адважных пагранічніках 17-га пагранатрада.

Тэатр

Т. ШЧАРБАКОВА

БУДЗЁННЫ «ЯЎГЕНІЙ АНЕГІН»

ПАСЛЯ ПРЭМ'ЕРЫ ПРАЙШЛО ШМАТ ГАДОЎ. ЦІ ЗАХАВАЎСЯ СПЕКТАКЛЬ ТАКІМ, ЯКІМ ЁН БЫЎ У ЧАС ПЕРШЫХ ПАКАЗАЎ! ДЛЯ ГЛЕДАЧА Ж ЛЮБЫ СПЕКТАКЛЬ — ПРЭМ'ЕРА!

ПРАБЛЕМА ЧАРГОВАГА ПРАДСТАЎЛЕННЯ — НАДЗЁННАЯ ДЛЯ ТЭАТРА.

«Анегін» Чайкоўскага—чарадзейны твор. Летуценна заспявалі скрыпкі, сумна ўздыхнулі драўляныя—і магія сардэчнай музыкі асвятліла вас цёплым чароўным ззяннем. Чары ва ўсім: у пяшчотна вібрыруючых, звонкіх, страсных маладых галасах распетага пушкінскага рамана, у фарбах — то адухоўленых, то прыцішаных —плаўных аркестравых мелодый. Узнёслая, інтымная і, у той жа час, па-зямному блізкая чалавеку музыка аб прыгожым і сумным каханні кружыць, ахутвае хвалямі непаўторнага хараства... Ці не таму так часта мы з радасцю шукаем сустрэч з мастацтвам такой гіпнатычнай сілы?

Але чулы і ўдумлівы слухач разумее, што бязмежная ўлада Чайкоўскага — не толькі ў магіі эмоцый, але і ў бляску розуму, у арыгінальнасці і ў дасканалай мастацкай форме оперы. У «Анегіне» музыкай кахання стала сама родная мова, песня, расплаўленая ў гарніле інтэлекту, прапушчаная праз фільтр строгай, мэтанакіраванай работы кампазітара. Наватарскі творчы вопыт Чайкоўскага нарадзіўся ў пакутах пераадолення *стылістычных канонаў* і выканаўчай інерцыі, быў выклікам тэатральнай руціне. У «лірычных сцэнах» вее свежы вецер шуканняў, і спробы замкнуць гэтую музыку ў цесным кубе прывычнага і зліналага — бясплённыя.

Што і казаць, музыка Чайкоўскага абрасла тоўстым пластам кампазітарскага і выканаўчага эпігонства. Яно—вынік вольнага «пераказу» арыгіналаў вялікага майстра без умення ўнікнуць у таямніцы яго мастацтва і зразумець, што запаланіўшая ўсіх выразнасць кантылены «Ты в сновиденьях мне являлся...» закладзена ў с а м і м м у з ы ч н ы м т э к с ц е, у яго патрабавальных інтанацыйна-рытмічных суадносінах, у гнуткай і дынамічнай канструкцыі. Душна і цёмна ў музыцы кампазітараў-эпігонаў, якія і сёння бяздумна «пребывают в интонациях из Чайковского». А якой недаравальна цьмянай бывае работа выканаўцы-эпігона, добраахвотніка ў культывацыі штампаў!

З операй «Яўгеній Анегін» мы жывём усё сваё жыццё: здаецца, што яна заўсёды была нам вядомая і зразумелая. Гэтак жа і на адным з апошніх прадстаўленняў яе ў Беларускім тэатры оперы і балета ўсё было вельмі знаёмае, лёгка пазнавальнае: зялёны сад і сінія гурбы снегу, блакітная летуценная Таццяна і ружовая какетліва-гарэзная Вольга, былі і даўнія знаёмыя — купюры ў 6 карціне, соладка заміраючыя, бясконца доўгія «мі» ў фразе Ленскага «Явится сейчас...» і бравурна скандзіраванае Анегіным «Пускай погибну я...» (з трыма ферматамі запар).

Спектакль быў будзённым. Канечне, няма ніякага сумнення ў тым, што прэм'ера выглядала б інакш. Зеляніна саду была б гусцейшая. Дзяўчаты не сядзелі б, утаропіўшыся ў дырыжора, а «мільгалі» б у кустах, як таго хацеў аўтар. Героі былі б менш грузныя, а Анегін не страляў бы на дуэлі, адвярнуўшыся ад Ленскага і зажмурыўшыся. Прывабны Трыфан Пятровіч не бегаў бы па сцэне ў пошуках Таццяны, каб даць ёй руку і «пуститься в пляс». Канечне, на прэм'еры загучала б арфа, заззяла б пазалота на ка*пітэлях скамечанай каланады* ў доме Грэміна, Анегін не падслухоўваў бы размовы юнага паэта з ветранай Вольгай... Многае было б свежым па фарбах, дакладным па атмасферы і тонка нюансіраваным па пачуццях...

І ўсё-такі спектакль сумны не таму, што пабляклі дэкарацыі, акцёры крыху забылі мізансцэны, а хор даўно не рэпеціраваў «Уж как по мосту, мосточку». Не, не таму. Старэйшыя школьнікі, якія запоўнілі ў той вечар тэатр, атрымалі «Яўгенія Анегіна» Чайкоўскага не ў арыгінале, а ў пастарэлай і трывіяльнай музычна-рэжысёрскай транскрыпцыі, выкананай людзьмі, якія даўно прывыклі да гэтай музыкі, як прывыкаюць да старога звыклага адзення.

Крыўдна! Бо «Анегін» — адзін з самых першых спектакляў Беларускага тэатра оперы і балета, і аб яго творчым лёсе трэба клапаціцца. Н е з а х о ў в а ц ь, час ад часу перасыпаючы нафталінам (падмалёўваючы), а с т в а р а ц ь н а н о в а для новых людзей, глядзець на яго маладымі вачыма.

Гэтаму ўменню вучыць і гісторыя тэатра. У пачатку свайго шляху, у 1933 годзе ён з м а г а ў с я за права ставіць гэтую оперу Чайкоўскага. Аддаючы даніну моднай тады вульгарнай сацыялагізацыі класікі, рэжысёр В. Барысевіч, мастак К. Дзясніцкі і дырыжор І. Гітгарц паставілі спектакль з Ларынай-Салтычыхай, з персанажамі, запазычанымі ў Гогаля ў сцэне правінцыяльнага балю, з шаржыраваным грымам і ў ілюзорных дэкарацыях. А праз тры ўжо гады тэатр узнавіў оперу з імкненнем гранічна наблізіцца да арыгінала. Рэжысёр М. Дыскоўскі пісаў тады аб намеры паставіць «сапраўднага» «Яўгенія Анегіна», а не яго «вольную» апрацоўку, і падкрэсліць лірычны пафас твора. І ў сувязі з гэтым спектаклем (дырыжор М. Шнейдэрман, мастак А. Марыкс) «Літаратура і мастацтва» пісала аб надзённай неабходнасці працягваць работу «над знішчэннем адвечна-опернай руціны і трафарэту».

Спектакль двойчы абнаўляўся ў пасляваенныя гады (1948 і 1955). Апошняя выканаўчая версія, падрыхтаваная дырыжорам Т. Каламійцавай, рэжысёрам А. Маралёвым і мастаком В. Мамантавым, да гэтага часу захоўваецца ў тэатры. Чаго ж у ёй бракуе?

Перш за ўсё пазіцыя дырыжора. Мяркуючы па тым спектаклі, аб якім я пішу, Т. Каламійцава бачыць сваю задачу ў дасягненні сінхроннасці вакальнага і аркестравага гучання і ў далікатным акампаніраванні. Трэба аддаць належнае вопытнаму дырыжору: у пастаноўцы з *такім разнародным* (у сэнсе вопыту, артыстычных дадзеных, культуры вакалу і г. д.) складам выканаўцаў, з «расхістанымі» харамі, з адстаючай у хуткіх tutti меднай групай, з мноствам «любімых» фермат у спевакоў, прыстойнае звядзенне «канцоў з канцамі» патрабуе вялікай увагі і спрыту. Опера, якая ішла без рэпетыцый, упэўненай рукой была праведзена з пачатку да канца.

Якая ж музычная трактоўка твора Чайкоўскага? На мой погляд, яна не зусім пераканаўчая, па-першае, таму, што дырыжор няўважліва ставіцца да аўтарскага тэксту. Са скрупулёзнай дакладнасцю выпісаныя кампазітарам драбнейшыя тэмпавыя ўказанні і спасылкі на метраном часта ігнаруюцца або самавольна змяняюцца. Так у аўтар*скай партытуры ва Уступе* да оперы адсутнічаюць якія-небудзь указанні на stringendo ў сярэдняй частцы, а Т. Каламійцава выконвае крайнія раздзелы павольней, чым сярэдні. Вяла і фармальна выканана ўсхвалёванае andantino ў канцы другой карціны. А Чайкоўскі ж выпісаў тут багатую дынамічную шкалу з дэталізаванымі тэмпавымі абазначэннямі. Прыклады такіх адступленняў ад арыгінала можна памножыць — у прыватнасці, за лік многіх «угодлівых ritenuto (у балеце гэта называецца — дырыжыраваць «пад ножку»).

Прычыны такога вольнага абыходжання з арыгінальным тэкстам, мне думаецца, у тым, што дырыжор вядзе оперу не па аўтарскай партытуры, а па вядомых выканаўчых канонах, якія даўно ўтульна ўляглісі ў памяці. Чым інакш вытлумачыць тую акалічнасць, што ў шостай карціне не выконваецца харавы фрагмент у 28 тактаў з тэкстам «Скажите, кто в толпе избранной...» і г. д. да слоў «Княгиня Гремина! Смотрите...»? Ці не тым, што гэты фрагмент да нядаўняга часу па традыцыі не выконваўся ў Вялікім тэатры СССР? Па той жа прычыне зняты і другі экасез.

Я пераканана ў тым, што задача дырыжора «Яўгенія Анегіна» зараз заключаецца ў тым, каб в я р н у ц ц а д а а р ы г і н а л а, адкінуць штампы і нанова пераагучыць аркестравую партыю. Цьмянае, маламалянічае гучанне ў межах нейтральнага mf іншы раз нівеліравана так, што з цяжкасцю ўлоўліваеш фактурны малюнак (напрыклад, у арыі Анегіна). Адсутнасць арфы нанесла спусташальны ўдар аркестравай тканіне ў сцэне пісьма і каларыстычна збядніла ўсю другую карціну ў цэлым.

Вакальна-сцэнічны бок гэтага звычайнага, чарговага спектакля таксама быў вельмі супярэчлівы. Не магу не сказаць пра дзіўныя адступленні пастаноўшчыкаў ад аўтарскага сцэнарыуму ў 3, 4 і 5 карцінах. Некаторыя мізансцэны адсутнічаюць наогул, што яшчэ больш збядняе і без таго вельмі скупое сцэнічнае дзеянне ў оперы Чайкоўскага.

У лютым 1955 года ў дні Дэкады беларускага мастацтва ў Маскве спектакль «Яўгеній Анегін» быў названы «вясновым», таму што выканаўцамі былі пачынаючыя, сцэнічна нявопытныя спевакі са свежымі, яркімі галасамі. Мне прыемна адзначыць, што самыя светлыя хвіліны пастаноўкі, пра якую ідзе гаворка, звязаны з выступленнямі маладых. В. Кірычэнка, В. Любінскі, М. Пушкароў эпізадычна ўзнаўлялі ілюзію вясновага спектакля «паводле Пушкіна». Пластычны і сцэнічна вельмі выразны В. Кірычэнка валодае галасам прыемнага тэмбру, цвёрда ведае партыю, дакладна інтаніруе. Праўда, і ён аддае даніну штампам. Ёсць у В. Кірычэнкі собінаўскае «Забудет мир меня...», лемешаўскае «Ах, Ольга, я тебя любил!» і неправамерна расцягнутае кода арыі з пятай карціны. Вельмі добры зухаваты Ротны — М. Пушкароў. Прыгожа, з захапленнем выканаў куплеты Трыке пачынаючы спявак В. Любінскі. Прывабныя і перспектыўныя вакальныя дадзеныя ў В. Садоўскай. Аднак незразумелыя матывы, якімі кіраваліся пастаноўшчыкі, даручыўшы нядаўняй выпускніцы Беларускай кансерваторыі партыю Ларынай (у Садоўскай драматычнае сапрана) у ансамблі з Н. Нікеевай (Таццяна) і Р. Асіпенка (Вольга). Ні вакальна, ні сцэнічна маладая спявачка не адпавядае ролі, якую яна выконвае, хоць вельмі старанна і чыста спявае, проста *і вольна трымаецца на падмостках*.

Самае горшае ўражанне пакінуў В. Ганчарэнка (Анегін). Які далёкі гэты сцэнічны Анегін ад арыгінала: ён цяжка і няўклюдна рухаецца, пазбаўлены грацыёзнага і разумнага ў кожным сваім жэсце. Знешняя неадпаведнасць герою Пушкіна і Чайкоўскага паглыбляецца недаравальна *пасрэдным* вакалам. Бедны ў тэмбравых адносінах і невыраўняны рэгістрава голас з пазбаўленымі колеру і вібрацыі верхнімі нотамі, недакладны рытм і інтаніраванне (асабліва ў высокім рэгістры), няздольнасць пластычна выканаць кантылену... ды, зрэшты, і густ, які пакідае жадаць многа лепшага... З такімі адносінамі да мастацтва, на маю думку, выходзіць на сцэну ў партыі Анегіна нельга.

Колькі існуе тэатральнае мастацтва, будзе існаваць і такая праблема — прэм'ера і чарговае прадстаўленне. *Як захаваць* усё тое трапяткое і непасрэднае хваляванне першаадкрывальнікаў, з якім тэатр знаёміць гледача з прэм'ерай? Як кожны раз пачынаць спектакль, быццам ні ўчора, ні месяц, ні год назад яго не ігралі, адкідваючы штампы і завучаныя інтанацыі?

Так, цяперашні спектакль «Яўгенія Анегіна» не назавеш вясновым. Паўтараю, не таму, што старэнне (акцёраў, інтэрпрэтацый, касцюмаў) у тэатры заўсёды бывае асабліва відавочным і сумным. Спектакль пастарэў музычна. Абяскроўленае, ілюстрацыйнае гучанне аркестра, да крыўды дзяжурнае спяванне з моцнай дозай традыцыйнага сентыменталізму — вось з чым нельга мірыцца. Аўтарская партытура *засмечана выканаўчымі* скажэннямі. Для таго, каб расчысціць арыгінальны тэкст, трэба глянуць на яго свежым позіркам і дакладна прачытаць тое, што напісаў Чайкоўскі. Толькі тады з'явіцца сапраўдная, а не ўяўная выразнасць і ажыве загубленая раўнадушным рамяством чароўнасць узвышанага лірызму.

ПАКУЛЬ ШТО НА ВУЧЭБНЫХ СТЭНДАХ...

ВЫСТАЎКА Ў ТЭАТРАЛЬНА-МАСТАЦКІМ ІНСТЫТУЦЕ

У Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце наладжана цікавая выстаўка. Экспануюцца вучэбныя ра*боты выхаванцаў мастацка*га факультэта — усіх яго аддзяленняў.

Жывапіс і графіка, скульптура і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, малюнак і дызайн — такімі раздзеламі акрэсліваецца профіль факультэта. Але найбольш цікавыя на гэтай выстаўцы работы, якія маюць прамыслова-прыкладны характар, — праекты мастацкага вырашэння грамадскіх інтэр'ераў, мадэлі мэблі і цацак, *распрацоўкі мастацка*га вырашэння станкоў, матацыклаў, асвятляльнай апаратуры, сувеніры з дрэва, шкла, абпаленай гліны, чаканку па метале, праекты ўпакоўкі вырабаў лёгкай прамысловасці, дываны і эскізы тканін, фарфоравы і керамічны посуд і г. д.

Многія з гэтых твораў сведчаць пра цесную сувязь навучальнага працэсу на факультэце з жыццём.

Вось праект мэблі для хола зборачнага цэха Мінскага гадзіннікавага завода. Вядома, што работа ў цэхах гэтага завода — напружаная: праз кожную гадзіну—паўтары робіцца перапынак. Улетку работніцы ў *часе перапынку* адпачываюць на адкрытым паветры, на траве. А ўзімку або ў восеньскія дажджы? Паводле студэнцкага праекта, неўзабаве будуць абсталяваны спецыяльныя холы — дырэкцыя завода адпускае сродкі на іх абсталяванне...

Праект мэбліроўкі і абсталявання кватэры-інтэрната Мінскага аўтазавода... Зручныя шафы, сталы, крэслы—сучасныя, з улікам габарытаў памяшкання. Праект ужо ажыццяўляецца.

Праект рэстаўрацыі славутага замка ў Міры і абсталявання ў ім музея. Аўтар праекта мае на мэце не столькі літаральнае ўзнаўленне колішніх інтэр'ераў, колькі перадачу перш за ўсё атмасферы эпохі. Грамадскія арганізацыі рэспублікі зацікавіліся гэтым праектам. Ёсць усе падставы спадзявацца, што ён з часам будзе ажыццёўлены...

Абсталяванне *паною* для гульняў у дзіцячым садзе. Мэбля і цацкі. Работнікі дзіцячых садоў і медыкі ўхвалілі гэты праект. Трэба цяпер, каб прапанаваныя мэбля і цацкі былі запушчаны ў вытворчасць.

Стол часопісны, які лёгка трансфармуецца ў абедзенны. Можна ўявіць, колькі ахвотнікаў набыць такі стол з'явілася б, калі б ён трапіў у продаж...

***Творчасць* выхаванцаў новага ў інстытуце аддзялення прамысловага мастацтва, якое яшчэ не паспела зрабіць ні аднаго выпуску, выдзяляецца культурай экспанавання. Хочацца, каб лепшыя з паказаных на выстаўцы праектаў былі хутчэй ажыццёўлены.**

Ул. БРЫГ.



Гэтая маленькая аповесць аб дзяцінстве таго пакалення, якому сёння за трыццаць, а то і пад сорак, аб дзяцінстве тых хлопчыкаў і дзяўчынак, чые душы бязлітасна апаліў пажар вайны...

***Гэта — пра мяне і пра цябе, мой та*варыш. Перажытае табой ніколі не забудзецца. Яно ў сэрцы, як рана, што ніяк не рубцуецца, не зажывае...**

АЎТАР.

1.

Прачнуўся я ад гаманы ў пярэдняй хаце. На сцяне ўжо трымцелі сонечныя плямы. З-за перагародкі далятала то ўсхваляваная скарагаворка, то гучны, таемны шэпт. Расказвала жанчына пра штосьці цікавае, незвычайнае, бо маці ўсё не давала веры, перапытвала:

— Але? Няўжо, цётачка, праўда? Ах, беднае дзіця, ах, гаротніца...

Спачатку я не ўслухоўваўся ў тую размову. Ці *мала пра што знойдуць* зранку пагаварыць жанчыны? Дастаў з-пад падушкі асколак люстэрка і агледзеў гуз. Прыгожы гуз... Праўда, ён ужо не тырчэў рогам, як учора, затое быў сіні, што сліва. І пацягнуў да сябе штаны...

І адразу шуснуў пад коўдру: гэта ж бабкі Настусі голас! Сказала яна пра ўчарашняе ці не?

—...Дык ты, кажу, унучка, сама сюды і дабіралася? Адна, без мамы, з-пад самага Гродна?—не сціхае Настуся.—Ага, кажа... Мама паехала далей на Усход, а яна адстала ад эшалона, дык проста сюды і... Ах, божа мой, ды худзенечкая, ды змізарнелая...—бабка пачала ўсхліпваць.

«У бабкі з'явілася нейкая дзяўчынка?—натапырыў я вушы.—Цікава... І адна ішла сярод немцаў *аж пад Слуцк? Здорава!*»

— А дзе цяпер мая дачушка, ці паспела выхапіцца з гэтай навалы—ніхто не ведае...—працягвае бабка.—Так цяжка, мне, так горна—хоць у рэчку сігай. Штосьці чуе сэрца... Няхай бы ўжо з Танечкай сюды прыбілася—тут усё-такі зацішней. А вось перачакалі б ліхалецце. А потым і пра Васільку свайго згадала... Паверыш, Анюта, да раніцы і на волас не замгнула.

— Ой, цётачка, мо яшчэ ўсё добра будзе... Мо абыйдзецца...—уздыхае ў адказ маці, звоніць скаварадой.—Ад нашых жа таксама як пайшлі ў першы дзень, дык ні слыху, ні дыху...

І чаго тут плакаць ды ўздыхаць—не разумею. Зайздросціць трэба, ганарыцца. Мой бацька і большы брат Міша, і бабчын сын Васіль недзе на фронце, фашыстаў б'юць. А мы сядзім тут у баку ад дарог і нават жывога немца добра не бачылі за два месяцы. Прыязджаў толькі раз са Слуцка легкавік з трыма немцамі і *адным не немцам*. Сагналі народ, лаяліся, чаму разабралі ўсё калгаснае па дамах, нашто падзялілі на палоскі і зжалі жыта. Потым галоўны немец у залатых акулярах аб'явіў, колькі збожжа мяса і малака трэба здаць вялікай Германіі. Урэшце сказаў, што чалавек у цывільным—Аляксандр Рудак. Ён прызначан у сяло старастам. Трэба, каб яго ўсе паважалі, загады выконвалі без пярэчанняў. Інакшай будуць караць па законах ваеннага часу.

Легкавік паехаў. А стараста адразу залыгаў і павёў ад бабы Настусі карову—калгасную рэкардыстку. Бабка яе выцягла па жарэб'ю, не ведала, куды падзець столькі малака, а цяпер засталася без нічога. Пагэтаму кожную раніцу яна і прыходзіць да нас...

— Дык, хіба, Анютка, выштукуй літраў два сёння... Няхай мая бежанка хоць пакаштуе ўдосталь...—даносіцца з кухні бабчын голас.

Калі за Настусяй, нарэшце, ляпаюць дзверы, я падхопліваюся. Цікава, сказала яна маме пра ўчарашняе, ці не?

— А, супастат... Драчонікі даўно пастылі, авец трэба ісці займаць, а ён храпе сабе! Прызнавайся, куды ўчора лазіў?—атакавала мяне маці.

— Нікуды...—буркнуў я і стаў мыцца.

— Як гэта нікуды? А кніжкі казённыя хто браў?—падступіла яна, распярэзваючы фартух.—Настуся ж не будзе хлусіць, як ты!

— Мы толькі хацелі паглядзець,—напалову прызнаўся я.

— Цікаўныя вельмі! Адны ўжо рыштанты нейкія «паглядзелі», не ўпільнавала Настуся, дык адны транты ад кніг засталіся...

Гнеў маці паступова аціхаў, фартуха яна так і не пусціла ў ход. Але сварылася на мяне ўвесь час, пакуль збіралася ісці займаць авечак.

Сёння нядзеля, і яна падмяняе мяне, дае пагуляць. А ў астатнія дні я крычу «Авечкі выганяй!» Аб лусце хлеба і бутэльцы малака кукую ў полі да вечара. Ды каб жа хоць хлеб быў людскі, а то... Чаго ў ім было больш—тоўчанай варанай бульбы ці жамерын з буракоў—не ведаю. Скарынка на бохане заўсёды падгарала, надзімалася, пячоры пад ёю былі такія, што лезлі мае дзве рукі. А з шэрага і глеўкага мякіша, салодкага да млоснасці, можна было выціскаць ваду. Каб на гэты хлеб да крупіначку *солі! Але соль маці ашчаджала мудрэй за му*ку—цяжка было дастаць.

З бульбянымі аладкамі я расправіўся хутка і амаль следам за маці выйшаў на двор. Мне трэба ісці сёння ў гумно. Яно адзінока стаіць у канцы суседняй сядзібы—уцалела ў час леташняга пажару. Хату ўжо гаспадар паставіў на другім, больш прасторным пляцы, а пажарышча да самага гумна калгас засеяў канаплямі. Яны выраслі на радасць нам і вераб'ям па самую страху. Сцёпка неяк казаў: каб такія канаплі былі скрозь вакол вёскі дык не трэба і лес—партызаны завяліся б адразу. Я веру

Паэтычная паверка

Сцяпан ГАЎРУСЁЎ

З КНІГІ «ПРОФІЛЬ ВЕКУ»

ЗАМІНІРАВАНЫЯ ЦАЦКІ

Мітусня туманоў парадзела,
Праглянуліся нівы ў расе.
Што на досвітку неба гудзела,
Чулі дзеці — ды чулі не ўсе.

Беглі лугам — не так, а ў абгонкі, —
Ажно вецер сустрэчны звініць.
Прыўставалі на цыпках рамонкі,
Каб шчаслівы той бег прыпыніць.

Каласоў наравістыя грывы
Ад малых ухіляліся рук,
Самы меншы і самы шчаслівы
Нешта ўбачыў. Спыніся, хлапчук!

О! Ён гэтак узрадуе бацьку,
Ды і маці — надзея з надзей!
І пад сонцам бліскучую цацку
Прыгарнуў да худзенькіх грудзей.

— Пакажы! Пакажы! — закрычалі,
Падбягаючы ўслед, сябрукі.
І знямелі ў смяротным адчаі —
Грымнуў гром, ды страшэнны такі.

Гэтай ліпеньскай раніцай яснай
Я пабачыў аблічча вайны
З гэтай вузкай і гэтай дачаснай
І да смерці балючай труны.

Правам воіна, клопатам бацькі
Я нагадваю сталым часцей:
— Не бярыце бліскучыя цацкі,
Што наш вораг нясе для дзяцей!

■ ■ ■

Мне сніўся сон:
Лагодныя вятры
Ішлі шырока ў горад беласценны,
Рака сцішала быстрыя віры
І — ад вады струменіў бляск праменны.

Мак палымнеў на схілах берагоў,
Віліся ўверх ступені па спіралі
Да воблакаў, бялейшых ад снягоў, —
Ад вышыні аж думкі заміралі.

І расхінаўся гэткі далягляд,
Што мімаволі ты прыжмурваў вочы,
І толькі я быў нечаму не рад,
У тым сабе прызнацца не ахвочы.

І толькі, агледзеўшыся наўкруг,
Я здагадаўся ў гэты ясны ранак,
Што непрыкметны ў горадзе тым рух,
Ніводны твар не бачны з-за фіранак.

На ўсім працягу волжскіх берагоў
Народ вянком пагойдваўся ўрачыстым,
І пурпуровасць схіленых сцягоў
Пералівалася пад небам чыстым.

Я зразумеў, што людзі ўсе прыйшлі
Аддаць пашаны сціплую даніну
Свяшчэннай акрываўленай зямлі
І — пакланіцца бацьку альбо сыну.

З іх кожны роднае аблічча нёс
І пад паглядам слаўных генералаў
Баяўся прачытаць сапраўдны лёс
На строгім мармуру мемарыялаў.

Іх многа тут, праслаўленых імён,
Што нашай славы здабывалі пошчак.
Шукаў я брата роднага, бо ён
Загінуў тут, адважны бранябойшчык.

Была віной асмужанасць вачэй
Ці сіняга паветра калыханне —
Я не знайшоў. І толькі з-за плячэй
Адчуў яго знаёмае дыханне.

Яшчэ ў маўклівай стоячы чарзе,
Я верыў, што нам з ім не размінуцца.
І, каб навек не знік ён у смузе,
Назад я пабаяўся азірнуцца.

■ ■ ■

У пурпурова-трапяткім прыполе
Мяне зара нячутна прынясла,
Калі раздольна гойдалася поле,
Калі чаромха сціплая цвіла.

Даверлівых праменняў пераліvы,
Раса, вады крынічнай саладзей,
Сцвярджалі мне, што буду я шчаслівы,
Што прынясу я радасць для людзей.

Што, бескарыслівa-звонкагалосы,
Вазьму любую ношу па плячу
І самыя высокія нябёсы
З штодзённасцю суровай спалучу.

Жыву, прыняўшы і зямлю і неба,
І кожны раз, як пачынае днець,
За тое, што зрабіў не так, як трэба,
Перад зарой гатоў пачырванець.

■ ■ ■

Забываюцца птушкі маленства — адтуль
толькі стрыманы вецер вяшчае:
трыбунал бесклапотных зязюль
за гадоў марнатраўства
прысуд абвяшчае.

А было —
таямніцай здаваўся мне свет,
які сёння
з балючаю скрухай прысніцца:
не патрапіць туды,
дзе пакінуў я першы даверлівы след
і таму я цяпер
для самога сябе таямніца.

Я — не фенікс,
каб зноў уваскрэснуць, і чую,
як ноччу завейнай
нехта ходзіць па лесе
і для хаты маёй падбірае ключы.
Маё сэрца!
Не стань жа ты птушкаю безнадзейнай
і ў грудзях —
шчабячы,
шчабячы,
шчабячы!

■ ■ ■

Бясспрэчных ісцін мала,
Менш — вечных, несумненна,
Для тых, каго ламала,
Як палку аб калена.

Дапытлівы я змалку —
Мне ўсе адказы выньце,
Абструганую палку
Нямогламу пакіньце.

Спакою не спазнаю
І косць мая — не вата:
Я многіх закранаю
Яршыста-сукавата.

Для мазалёў рабочых
Дай праўду цэлай кронай,
А кволенькі лісточак —
Наіўнасці зялёнай.

Надрукавана ў «Полымі»

ВУЗЛЫ ЛЮДСКІХ ТРЫВОГ

НОВЫ РАМАН Івана ШАМЯКІНА

ДУЖА ДОБРА, калі пра кнігу можна сказаць, што ў ёй многа праўды. Будзем толькі мець на ўвазе, што гэтаму слову часам надаюць рознае значэнне. Адных задавальняе фатаграфічная дакладнасць факта, няхай сабе і дробязнага, прыватнага, і яны апладзіруюць аўтару. Другія гатовы ўгледзець жыццёвую праўду ў вонкавым падабенстве мастацкіх вобразаў з іх рэальнымі прататыпамі, трэціх захапляе дробная дэталь і мала цікавіць агульная карціна. А праўду не абмяжуеш ні падробкамі пад рэальнасць, ні загадзя падрыхтаванымі стандартнымі адказамі на ўсе новыя пытанні жыцця...

На другім пленуме аргкамітэта ССП Луначарскі гаварыў, што праўда «не сядзіць на месцы, праўда ляціць, праўда ёсць развіццё, праўда ёсць канфлікт, праўда ёсць барацьба, праўда ёсць заўтрашні дзень і трэба бачыць яе менавіта так». Ад сябе дадамо: мастацкая праўда — катэгорыя партыйная і да яе нельга падыходзіць з рознымі меркамі, падмяняць яе паўпраўдай, дыпламатычнымі хітрыкамі.

Гэта першыя думкі, якія апаноўваюць цябе, калі чытаеш новы раман Івана Шамякіна «Снежныя зімы», надрукаваны ў часопісе «Полымя» (№№ 11—12 за 1968 год). Пісьменнік адлюстроўвае сучасны канфлікт паміж сумленнымі людзьмі і кан'юнктуршчыкамі, што ўмеюць прыстасоўвацца да любых умоў. Учора чалавек, каб дагадзіць кіраўніку, забараняў калгасам і саўгасам сеяць канюшыну і авёс, загадваў культывіраваць кукурузу і там, дзе яна не дае добрых ураджаяў. А сёння, нават не чырванеючы, быццам памыляўся не ён, а нехта іншы, гаворыць: «Хто не працуе, той не памыляецца».

Іван Шамякін здолеў сказаць новае слова пра сучасную нашу вёску, пра кіраўніцтва сельскай гаспадаркай. Многім аўтарам здаецца, што калі памылкі мінулых дзён асуджаны, тым самым яны ўжо не могуць даць рэцыдываў, паўтарыцца ў новай варыяцыі. У рамане «Снежныя зімы» такой паўпраўдзе проціпастаўлена суровая партыйная праўда: акрамя правільных і своечасовых рашэнняў патрэбна таксама і гатоўнасць усіх без выключэння людзей сумленна і добраахвотна выпраўляць памылкі, падтрымліваць разумную ініцыятыву, заахвочваць пошукі новых шляхоў уздыму ўсіх галін сельскай гаспадаркі. У гэтым і ёсць квінтэсенцыя вострага канфлікту цэнтральнага героя рамана Антанюка з тымі, хто выпхнуў на пенсію здаровага, дужага, поўнага нерастрачаных сіл працаўніка шаблонных рашэнняў, а цяпер бессаромна паўтараюць яго думкі, прыпісваючы іх сабе. Яны гатовы нават на гуманны жэст: прыходзь, Антанюк, працуй, толькі, калі ласка, не ўздумай прасіцца на ранейшае месца. А зразумець гэта трэба так: твая поўная рэабілітацыя ўдарыць па аўтарытэту тых, хто пакараў цябе за праўду і шчырасць, а яны ж засталіся пры сваіх пасадах і псаваць ім настрой не варта. Шкада толькі, што вобразы шматлікіх працаўнікаў Антанюка паказаны занадта эскізна.

Палавінчатая прынцыповасць і палавінчатая справядлівасць... Антанюк на гэта не хоча згаджацца, бо, урэшце, яму не партфель патрэбны, а справядлівасць. Гэта канфлікт жыццёвы, рэальны.

Антанюк — чалавек жывы, неспакойны, са складаным і супярэчлівым характарам, са слабасцямі, якія ўласцівы натурам эмацыянальным, уражлівым. Пра гэта яскрава сведчыць і яго партызанская, далёкая ад агульнапрынятага шаблону біяграфія.

Не кожны камандзір паверыў бы жонцы паліцая, калі яна нават і ўцякла ад мужа ў лес за нейкі тыдзень да родаў. А думкі і пачуцці, народжаныя ў душы камбрыга, калі ён пачуў першы крык дзіцяці ў партызанскай зямлянцы і даведаўся, што маладой маці пагражае смерць ад пасляродавай гарачкі, а яе дачушцы — ад голаду? Толькі чалавек з вялікай літары, сапраўдны гуманіст і мог дазволіць сабе такое: пасляць разведчыкаў у акупіраваны ворагам гарадок, каб прывезці акушэрку, немку, якая да вайны працавала ў мясцовай бальніцы. Рызыка? Так, рызыка, але ў імя жыцця, у імя чалавечнасці. А пошукі каровы, прадпрынятыя асабіста Антанюком, каб карміць малаком кволенькую дзяўчынку? Гэта самыя хвалюючыя старонкі рамана. І не для «маралістаў» напісаны раздзелы рамана, прысвечаныя шчасліваму і разам з тым нешчасліваму каханню Антанюка і Надзі, камандзіра і самаадданай жанчыны, якая смела парвала з мужам-здраднікам і ўпершыню спазнала і ўнутраную свабоду, і шчырасць чалавечых адносін.

Гэтая далёка не банальная гісторыя двух мужных сэрцаў дала пісьменніку магчымасць палемічна завастрыць надзвычай важную маральную праблему — аб шчырасці і праўдзе ва ўзаемаадносінах бацькоў і дзяцей. Ці заўсёды апраўдвае сябе ўхіленне ад шчырага прызнання памылак, утойванне непрыемных фактаў ва ўзаемаадносінах бацькоў і дзяцей? Прыгадаем: Надзя гадавала дачку Віту, мяркуючы, што яна не павінна ведаць праўду пра свайго бацьку-паліцая. Віта лічыла, што яна — дачка партызана, які загінуў у блакадзе. Калі дзяўчына пачала здагадвацца, што ад яе нешта ўтойваюць, бацькам назваў сябе Антанюк, у якога і тады, у вайну, была свая сям'я. Ці патрэбна была такая двайная мана, хоць і прадыктаваная найлепшымі намерамі? Аўтар рамана не дае адназначнага адказу, бо гэта і немагчыма. Але ўжо адно тое, што «святая мана» ўскладніла адносіны Антанюка з жонкай і дзецьмі, а ў Віты, калі яна ўведала праўду не ад блізкіх людзей, а праз ананімку, адбіла давер'е да маці і яе партызанскага рыцара, надае гэтай сумнай і незвычайнай гісторыі трагедыйны пафас. А наконт адказу, у чым вінаваты і ў чым невінаваты Антанюк і Надзя, няхай чытач сам падумае.

Вабіць сама нязвыкласць і навізна жыццёвага матэрыялу, выкарыстанага аўтарам для пастаноўкі і творчага рашэння пастаўленай ім мастацкай задачы. Радуе і майстэрства, творчая расказанасць і смеласць, якія былі заўжды ўласцівы Івану Шамякіну, але на гэты раз праявіліся з яшчэ большай сілай. Прыгадаем ранейшыя раманы, аповесці і апавяданні пісьменніка. Усе яны пераважна бралі за жывое і вернасцю жыццёвай праўдзе, і напружаным сюжэтам, які даваў героям найлепшую магчымасць праявіць свой характар, сваю чалавечую сутнасць. Лепшыя героі Івана Шамякіна — людзі актыўныя, занятыя надзённымі справамі, усе яны ўдзельнічаюць у канфліктах, што закранаюць і іх практычную працу, і іх стаўленне да жыцця. У людзей ёсць і рабочая пляцоўка, і поле бою, і неабходныя магчымасці для адстойвання сваіх пазіцый. Антанюк у рамане «Снежныя зімы» такіх магчымасцей як быццам не мае. Тым не менеі за яго паводзінамі сочыш з напружанай увагай. Чым гэта дасягаецца? На маю думку, адным: псіхалагічным паглыбленнем вобраза, сінтэзам інтэлектуальнасці і пачуццёвасці. Аб'ектам мастацкага даследавання сталі думкі і перажыванні цікавага чалавека. І гэта ўжо многа.

З аўтарам можна пагаджацца ці не пагаджацца ў дэталях, але раман у цэлым — удача пісьменніка.

Магчыма, што той жа Антанюк, пры наяўнасці пэўнай сферы для прыкладання сваіх сіл і практычнай дзейнасці, значна лепш і паўней праявіў бы сябе. Для пенсіянера ён, праўда, даволі актыўны. А ўявіце, што Антанюка не паслалі дачасна на пенсію, а толькі панізілі ў рангу. Былі ж і такія пакаранні так званым антыкукурузнікам і абаронцам траў. Мабыць, тады канфлікт стаў бы вастрэйшым. Пасля шматлікіх твораў з вострымі «падзейнымі» сюжэтамі Іван Шамякін паказаў сябе майстрам і ў сюжэце ўнутраным. Мушу, праўда, сказаць, што такая амаль поўная адсутнасць падзей у раздзелах, прысвечаных Антанюку-пенсіянеру, не ва ўсім апраўдала сябе.

Так, аднаго толькі ўдзелу ў рабоце грамадскіх камісій занадта мала, каб Антанюк мог поўнасцю рэалізаваць свае магчымасці. Яму нават цяжка адказаць на пытанне — калі і як перарадзіўся яго дружбак, былы начальнік штаба партызанскай брыгады, а цяпер — папулярны вучоны-машынабудаўнік, прэтэндэнт на ўзнагароды і падзякі? Тады, у вайну, у Будыкі былі свае слабасці — хіхікаць у кулак, калі камандзір нешта зрабіў не так, выстаўляць напаказ сваю святасць і цнатлівасць, дэманстраваць сяброўскую аддансць камандзіру і пры зручным выпадку шапнуць таму-сяму аб яго слабасцях і грахах. Але ў галоўным гэта быў надзейны саратнік. Абодва — і Антанюк, і Будыка ў партызанскіх раздзелах рамана моцна прывязаны да сюжэта. І сувязь гэта слабее, калі іх шляхі-дарогі зноў перакрыжоўваюцца, але ўжо ў новых умовах.

Антанюк — персанальны пенсіянер, Будыка — кіраўнік інстытута, дзе праектуюцца новыя машыны. Першы — сама сумленнасць, другі — кан'юнктуршчык, плагіятар, аматар паказухі, кар'ерыст. Поле дзейнасці ў людзей рознае. Антанюк згаджаецца ўдзельнічаць у комплекснай праверцы інстытута і нават не мае магчымасці давесці справу да канца, ды ў машынах і аўтаматах ён, аграном, не дужа разбіраецца. Абодва, як кажуць, застаюцца пры ўласных інтарэсах. Вельмі цікавы канфлікт не знайшоў свайго поўнага выяўлення, бо Антанюку цяжка ўплываць на інстытут, да якога ён не мае непасрэднага дачынення. Сюжэтная лінія Антанюк — Будыка абрываецца раней, чым гэта вымагаецца характарам канфлікту паміж імі. Ды і сілы ў гэтых людзей няроўныя.

Сваім раманам Іван Шамякін яшчэ раз давёў, што для мастацкай праўды мала адной толькі фатаграфіі фактаў, якія вынесены на паверхню хаатычным патокам жыцця. Мастацтва пачынаецца там, дзе ёсць адбор, дзе добра відаць перспектыва, дзе другараднае, выпадковае не засланяе сабою агульнага. Пры строгім і прадуманым мастацкім адборы пісьменнік можа адмовіцца ад выпадковых і дробных дэталей, якія нічым не дапаўняюць агульную карціну, і перабольшваць, завастраць тое, што найлепш адпавядае дыялектыцы жыцця, убачанага ў руху, развіцці, удасканаленні.

У апошні час стала нейкай модай гаварыць аб тым, што пэўная частка моладзі перастала лічыцца з аўтарытэтам бацькоў. У рамане «Снежныя зімы» сказана важкае слова і пра гэта. Так, праблема бацькоў і дзяцей заўсёды існавала і, відаць, будзе існаваць, бо ўзрост мае свае законы і нельга патрабаваць ад неспакушанага, неспрактыкаванага юнака, каб ён разумеў усё гэтак жа глыбока, як сталыя людзі, ветэраны працы. І калі дарослыя дзядзькі пачынаюць караць сына Антанюка Васю і яго таварышаў-студэнтаў за не зусім, мабыць, разумныя формы пратэсту супраць выкладчыка-прыстасаванца, які лёгка мяняе ацэнкі гістарычных падзей, то гэта, напэўна, тая ж, асуджаная партыяй, перастрахоўка. Верхагляды крычаць: «Бунт! Анархія! Усыпаць завадатарам!» Так лічыў і Антанюк. Ён жа сам і пакараў Васіля, сына. І толькі пазней гэты сумленны і шчыры чалавек, зірнуўшы глыбей, здагадаўся: студэнты мелі падставу для абструкцыі самазакаханаму невуку, які чытае па старых канспектах, зрабіўшы толькі пэўныя купюры. А калі гэта так, то павінны ж былі маладыя людзі неяк рэагаваць, і крамолы ў гэтым няма.

Праблему бацькоў і дзяцей Антанюк вырашае так: «Быў час, калі сутыкнуліся бацькі і дзеці, калі дзеці вінавацілі нас ва ўсіх грахах мінулага, нашых і чужых... Але мы, бацькі, гэтак жа агульна... адмяталі ўсё, чапляліся за мінулае і мімаволі прывязвалі сябе да таго, да чаго не мелі дачынення, супраць чаго змагаліся ўсім сваім жыццём... А, па сутнасці, усім нам, бацькам і дзецям, патрэбна крыху больш аб'ектыўнасці і самакрытычнасці».


Антанюку трэба шчыра разабрацца ва ўсім, каб зразумець сваіх дзяцей: Васіля, Ладу, Маю, партызанскую дачку Віту. Героі рамана свабодна бяруць на сябе адказнасць за памылкі і іх ліквідацыю, за выбар шляхоў у заўтрашні дзень. Вы ўжо не можаце забыць Антанюка, Надзю, Віту, вашы адносіны да іх характарызуюцца ёмкім словам: суперажыванне.

Такая кніга — радасць для кожнага, хто любіць нашу літаратуру і хоча, каб яна духоўна ўзбагачала людзей, гаварыла ім праўду аб жыцці, вучыла актыўнаму стаўленню да ўсяго, што закранае інтарэсы савецкага чалавека.

Я. ГЕРЦОВІЧ.

У ПАМЯЦІ СЯБРОЎ І ЧЫТАЧОЎ

Да 60-годдзя з дня нараджэння Элі Кагана



У Элі Кагана ёсць апавяданне пра сваё першае знаёмства з творамі Шолама-Алейхема. Гэта было ў 1919 годзе ў Мінску, акупіраваным белапалякамі. Элю было тады дзесяць гадоў, і яму добра запомніўся той кашмарны час. Сям'я хавалася ў цёмным сырым склепе. Хлеба не было. Елі моркву, сырую капусту. Бацька, рызыкуючы жыццём, выбіраўся начамі са склепа, каб папоўніць запасы морквы. Аднойчы яму пашанцавала: дзесьці ён знайшоў тоўсты том Шолама-Алейхема. Пры святле лучыны бацька ўголас чытаў аповесць «Хлопчык Мотл», і ў гэтай сырой магіле ўпершыню пачуўся смех...

Магчыма, менавіта тады, Эля Каган і пераканаўся, што гумар вельмі патрэбен людзям. Ім не толькі выпраўляюць заганы, але і лечаць засмучаныя сэрцы. Вось чаму, стаўшы пісьменнікам, Каган даў волю пачуццю гумару, якім ён, трэба сказаць, быў надзелены вельмі шчодра.

Эля Каган быў гумарыстам, а не сатырыкам. Гумарыстам і лірыкам. Героі яго твораў — у асноўным дэкласіраваныя элементы, якія ў гады першых пяцігодак уцягваліся ў сацыялістычнае будаўніцтва, станавіліся рабочымі, членамі арцеляў, калгаснікамі. У гэтых людзей заставаліся «перажыткі», і гэта рабіла іх смешнымі. Нямала сярод герояў Кагана і проста дзіваноў, якія, як вядома, упрыгожваюць жыццё.

Здаралася, што год-два нічога не выходзіла з-пад пяра Элі. І тады чытачы злаваліся на яго. А Ізі Харык, рэдактар часопіса «Штэрн», ставіў пытанне аб ім на сходах камсамольскай ячэйкі Саюза пісьменнікаў, гаварыў, што гэты малады чалавек таленавіты, але гультай, чым і губіць свой талент.

— Эля, — гаварылі яму сябры, — Харык мае рацыю. Трэба пісаць.

Аднойчы, выслухаўшы чарговае настаўленне, Эля сказаў:

— Надакучылі вы мне з вашымі прэтэнзіямі. Паеду ад вас. Штосьці ў Магнітагорск пацягнула.

І неўзабаве паехаў. І прывёз цудоўнае апавяданне «Горад без цэркваў», дзе таксама былі і добры гумар, і сардэчная лірыка.

Сяброў Эля меў вельмі шмат. Рэдка яго бачылі аднаго, заўсёды ў акружэнні самых розных людзей. І людзі яго любілі. Пра гэта гавораць франтавыя сябры Элі, якія да гэтага часу перапісваюцца з яго родзічамі і сваякамі. На ўсё жыццё запомніўся ім чарнявы, з вялікімі вачыма юнак, які ў самыя цяжкія хвіліны ўмеў развесяліць і падбадзёрыць жартам.

22 чэрвеня 1944 года каля палескай вёскі Заля Эля быў смяротна паранены. Калі прыйшлі санітары, ён сказаў ім:

— Вывезіце раней цяжка параненых, я яшчэ пацярплю.

Пад раніцу ён памёр ад газавай гангрэны...

Імя Элі Кагана залатымі літарамі высечана на мемарыяльнай дошцы ў Саюзе пісьменнікаў.

Яго не забудуць ні сябры, ні чытачы.

Р. РЭЛЕС.

Вышлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Беларуская ССР. Адміністратыўна-тэрытарыяльнае дзяленне на 1 студзеня 1968 года. Выданне чацвёртае. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 9.500 экз. 256 стар. Цана 52 кап.

Беларуская ССР. Брэсцкая вобласць. Ілюстраваны гісторыка-эканамічны нарыс (Серыя «Вобласці нашай рэспублікі»). Мастак Ю. Зайцаў. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 20.000 экз. 192 стар. Цана 76 кап.

Беларуская ССР. Віцебская вобласць. Ілюстраваны гісторыка-эканамічны нарыс. (Серыя «Вобласці нашай рэспублікі»). Мастак Ю. Зайцаў. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 20.000 экз. 200 стар. 79 кап.

Беларуская ССР. Гомельская вобласць. Ілюстраваны гісторыка-эканамічны нарыс. (Серыя «Вобласці нашай рэспублікі»). Мастак Ю. Зайцаў. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 20.000 экз. 212 стар. Цана 81 кап.

Беларуская ССР. Гродзенская вобласць. Ілюстраваны гісторыка-эканамічны нарыс. (Серыя «Вобласці нашай рэспублікі»). Мастак Ю. Зайцаў. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 20.000 экз. 184 стар. Цана 71 кап.

Беларуская ССР. Мінская вобласць. Ілюстраваны гісторыка-эканамічны нарыс. (Серыя «Вобласці нашай рэспублікі»). Мастак Ю. Зайцаў. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 20.000 экз. 192 стар. Цана 77 кап.

Беларуская ССР. Магілёўская вобласць. Ілюстраваны гісторыка-эканамічны нарыс. (Серыя «Вобласці нашай рэспублікі»). Мастак Ю. Зайцаў. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 20.000 экз. 174 стар. Цана 75 кап.

Сцёпу. Ён самы большы ў нашай кампаніі, гаворыць ужо хрыплым басам, а не так піскліва, як Пятрусь. Пагэтаму мы і прызналі Сцёпу за камандзіра.

Цудоўна пахнуць каноплі — нібы яловы лес. Ёсць сцяблiны таўшчынёй з палку і высозныя-высозныя... Толькі на макаўках хістаюцца ўбакі цёмна-зялёныя шапкі. Акурат, як у сосен!

Я на хаду выцярушваю і кідаю ў рот салодкія, шэрыя зярняткі, прабіраюся на другі край зарасніку. Там, блізка каля плоту бабкі Настусі, стаіць уцалелая ад пажару цукроўка. Пастараўшыся, можна наапорваць яшчэ кішэню смачных груш.

Раптам я абмёр: хтосьці ўжо шастаў на самым вяршэчку дрэва. Але гэта быў і не Пятрусь, і не Сцёпка.

— Эй, а ну — злазь! — крыкнуў я. Мы, «узгоркаўцы», цярпець не маглі забіяцкіх «канчанскіх» хлапчукоў.

На грушы прыціхлі, прытаіліся. Я рашуча ламлюся праз каноплі да цукроўкі і не паспяваю зноў адкрыць рот, як зверху заверашчэлі:

— Не падыходзь!!! А то скокну проста адсюль, і будзеш вінаваты! Адвярніся...

Гэтага яшчэ не хапала... Я спыняюся на месцы і нібыта адварочваю галаву ўбок, а сам бачу ўсё. Бачу, як смуглявая, падцыглястая дзяўчынка ў адной майцы і трусах спрытна спускаецца ўніз, а з апошняй галіны скакае проста ў двор бабкі Настусі. Дзяўчынка зрывае з вяроўкі блакітную, у ледзь прыкметныя белыя гарошыны сукенку і таропка ўсцягвае на сябе. Сукенка мокрая, і ні за што не хоча ўзлазіць. Перашкаджаюць і грушы, схаваныя пад майку.

— Эй, давай памагу! — крыкнуў я і кпліва зарагатаў.

— Дурань... — адрэзала яна і прысела спіною да мяне, стала папраўляць сукенку.

— Я ведаю, ты — Таня... Гэта праўда, што ты ад самай граніцы ішла пехатой адна? — падышоў я да плоту, узяўся за штыкеціны.

Дзяўчынка зноў павярнулася да мяне тварам, але паводзіла сябе тэк, быццам мяне і на свеце не было. Варочала на другі бок бялізну, узіралася ў яе, нібы сілілася пазнаць, і штосьці пацiху напявала. Я разглядаў яе твар, моцна загарэлы. Калі падымала вочы, цёмныя, самотныя, яны здаваліся мне без зрэнак. Бялявыя, коратка і няроўна падрэзаныя валасы былі адкінуты назад і прыхвачаны кавалачкам грабянца. Мусіць былі некалі косы, і ці не сама яна іх адрэзала? Вочы вельмі цёмныя... Я не бачыў яшчэ такога дзіва, каб у чалавека былі светлыя валасы і такія цёмныя вочы.

З боку гумна данесліся тры кароткія, нецярплівыя свісткі. Я схамянуўся, свіснуў у адказ два разы працягла і кінуўся ў каноплі.

Падумаць толькі, з-за нейкай дзяўчынкі я ледзь не спазніўся на збор!

Толькі прасунуў галаву ў падваротню, як хтосьці наваліўся зверху, прыцiснуў мяне тварам да току.

— Пароль!

— Будзь гатоў! — прахрыпеў я, выплёўваючы з рота пацяруху.

— Заўсёды гатоў! — адказаў Сцёпка і пусціў мяне.

— Ты што — задушыць мяне хацеў? — накінуўся я на камандзіра. — Думаеш, табе ўсё можна, так? Табе ўсё дазволена? — пеўнем наскокваў я на яго, а самому хацелася плакаць ад крыўды.

— Ніхто цябе не душыць... А калі б гэта быў шпіён? — апраўдваўся Сцёпа, ідучы ў прыцемку ў правы куток, на кучу леташняй перабітай саломы.

— Дзяцел насаты... — не мог я супакоіцца. — Ты ж у шчыліну бачыў, хто ідзе...

— Ну, будзе вам, хлопцы, — прымірэнча азваўся з кутка Пятрусь.

Паднёсшы да промня, які біў са сцяны, нейкую кнігу, ён уважліва разглядаў яе, размахваў правай рукою.

— Дакладвайце аб выніках аперацыі, — паваеннаму загадаў Сцёпа.

— А што тут дакладваць, — сказаў Пятрусь. — Я толькі адну вынес. Нейкая «Мгер из Сасуна».. Вершамі напісана... Мабыць, добрая, бо глядзіце, што на вокладцы! — ён працягнуў кніжку мне, і я зразумеў, што Сцёпа бачыў ужо.

Вокладка была жоўтая і цвёрдая, як костка. Зверху да нізу яе перaразаў нейкі жалабок, пакрыты бліскучай пазалотай. Углядаюся лепш... Ух ты!.. Дык гэта ж меч! Вялізны, прыгожы і, мабыць, востры-востры. У мяне аж дух захапіла.

— Каб нам такі... — летуценна шаптаў Пятрусь.

Сцёпа перавёў позірк на мяне.

Я моўчкі разгроб ля сцяны салому і дастаў загорнутыя ў чыстую анучку кнігі — «Міколка-паравоз» і «Ціль Уленшпігель». Мае любімыя, не раз перачытаныя... Як там? «Попел Клааса стукае ў маё сэрца...»

— І гэта ўсё? — здзекліва спытаў камандзір.

— Усё! — ускіпеў я і без таго ўзлаваны на Сцёпу. — А ты пакажы, колькі сам вынес!

— Мне нічога не трапілася цэлага... — стаў выкручвацца Сцёпка. — Але ж я прыдумаў гэтую аперацыю!

— «Прыдумаў»... «Я-я»... Заякаў! Прыдумваць лягчэй, чым рабіць. Баязлівец ты, вось хто!

— Я?! Баязлівец? — камандзір рынуўся на мяне, і мы пакаціліся па саломе клубком.

— Хлопцы... Сцёпа! Коля! Ды перастаньце ж! — мітусіўся вакол нас Пятрусь. Але нам было не да яго, мы ўсё болей раз'юшваліся.

Учора надвячоркам, як прыгнаў я з поля авец, вынялі мы шыбу ў тым класе школы, дзе стаялі шафы з кнігамі. Я палез першы, за мною — Пятрусь, і толькі потым — Сцёпа.

Мы спазніліся ратаваць школьную бібліятэку. Уся падлога была загрувашчана падранымі кнігамі і сшыткамі. «Сволачы, горш за фашыстаў!..» — ледзь не плакаў Петрусёк, праклінаючы тых, хто «пагаспадарыў» тут да нас. Мы перагрэбваліся ў папяровых гарах, як тыя жукі, чхалі, кашлялі. Тады я і знайшоў «Міколку-паравоза» і «Ціля Уленшпігеля», засунуў пад кашулю. Яшчэ трапіў мне ў рукі Пушкін без пачатку, без канца.

І раптам за акном мы пачулі голас бабкі Настусі: «А кыш, кыш, кыш... Няма на вас ўпадку...»

Мы дапусцілі вялікую памылку. Каб затаіліся тады, прыціхлі ў кутку, то неўгамонная бабка нічога не заўважыла б і пайшла. А Сцёпа, што заяц, скокнуў да другога акна і давай бразгаць зашчапкамі, каб хутчэй даць лататы. Тады і я падляцеў да нашай дзіркі ў акне, хуценька прасунуў у двор рукі з кнігай і галаву. Трымацца самому не было як, задрыгаў нагамі і рукамі, бы жабяня, потым шпурнуў Пушкіна ў траву. «А, зладзеі! А, нягоднікі, зноў вы тут...» — падляцела Настуся, схапіла кнігу і пачала дубасіць мяне па галаве, па плячах. Як вісеў я, так і даў нырца пад ногі старой — у нейкі камень ілбом. Войкнула бабка з перапуду, а я падхапіўся і ходу. Бачыў, як уперадзе мільгалі па загуменні лыткі Сцёпы і Петруся...

Пакуль мы качаліся са Сцёпам, увесь гэты ўспамін прамільгнуў перад вачыма, як у кіно. А яшчэ кажа ён, што не палахлівец! Што не пёр, як заяц!

— Вось... Вось... Вось табе... — асядлаў урэшце мяне Сцёпа.

Што было б далей, я не ведаю. Мусіць, Сцёпа мяне добра набіў бы і мы пасварыліся б назаўсёды.

— Ха-ха-ха! — пачулася нечакана з-за сцяны гумна. — Ну, давайце яшчэ разок — хто каго? Ха-ха-ха...

Сцёпа ўсхапіўся з мяне і нырнуў пад вароты.

А я ўбачыў у шчыліне Таніны вочы. Цёмныя-цёмныя... Яны глядзелі ў сярэдзіну дзёрзка, смела і не былі такія сумныя, як там, ля грушы.

Высачыла!..

Вочы прапалі. За сцяною пачалася валтузня.

— Лезь! Ну!.. — грымеў праз момант ужо каля ўваходу грозны голас Сцёпы.

Нам відно, як замерлі ля варот насупраць адны другіх дзве пары босых ног. Меншыя і ружовыя патапталіся на месцы, падагнуліся. Таня стала на колінцы і без кропелькі страху, з цікаўнасцю зазірнула ў падваротню, затым яшчаркай юркнула да нас. Следам за ёю пралез Сцёпа, схапіў Таню за руку вышэй локця і павёў да нас у куток. Хіба ён баяўся, што яна пырхне, як пташка, у паветра? Калі наблізіліся, Таня варухнула, вызваляючыся плечуком, сарамліва папрaвіла на грудзях сукенку. Гарачыня хлынула мне ў твар: я зразумеў, што не грушы тады востра тырчэлі ў яе пад майкай... Сцёпа таксама хуценька адхапіў сваю руку, нібы апёкся. Каб прыхаваць збянтэжанасць, загадаў:

— Сядай! Судзіць будзем, шпіёнка...

— Што-о?! Ха-ха-ха! — залілася Таня. — Гэта ты будзеш мяне судзіць, чапля? — накінулася яна на Сцёпку. — А мо ты, Верабейчык? — да Петруся. — А можа ты, сыч надзьмуты? — глянула на мяне.

Мы разгубіліся — атака была вельмі імклівая. Не паспелі нічога сказаць, як дзяўчынка зноў падсыпала:

— Я ўсё чула і бачыла, героі... Ледзь не ўпала ад смеху. Прыміце і мяне ў сваю кампанію... Мо яшчэ куды палезеце...

— Мы дзяўчат не прымаем! — адрэзаў я.

— Не жаночая справа з немцамі ваяваць, — піскнуў Пятрусь.

— Ага! І кацiся адсюль гарбузом... Ну! Ды трымай язык за зубамі, а то... — Сцёпа патрос у яе пад носам кулаком. Мусіць, здорава пакрыўдзіўся за «чаплю». Хлёстка яна яго ахрысціла.

— Ну і чорт з вамі, ваякі жаўтаротыя, — падхапілася яна. — Толькі пялёнкі часцей мяняйце! — крыкнула ад варот і слізганула ў шчыліну.

— Ух! — аж задыхнуўся ад злосці Сцёпа, паімкнуўся было за ёю.

Мяне чамусьці ўсё гэта не вельмі кранула. Толькі адчуў раптам, што прайшла мая злосць на камандзіра. Цела ахапіла млявасць, мне сталі абыякавымі ўсе нашы гульні і справы. Такі ж настрой, мабыць, ахапіў і Петруся, бо ён сядзеў ціхі, нахмураны, як верабей пад страхою. Сцёпа таксама вяртаўся да нас паволі, апусціўшы доўгія рукі. І ён задумаўся, што робім мы не тое, што трэба. А што трэба? Што мы маглі прыдумаць, каб насаліць немцам? Дый немцаў жа ў сяле не было ніводнага!

— Выкладвайце, што назапасілі за гэтыя дні, — сабраўся з духам камандзір.

Мы вывернулі кішэні. У Петруся было штук дзесяць патронаў ад рускіх вінтовак і кавалак пустой кулямётнай стужкі. Я дастаў жменю ружовых, таўшчынёй з аловак, палачак. Узрывальнікі... Яны здорава пэнкаюць у агні, і хлапчукі ні за што не хацелі аддаваць. Не раз даводзілася ўлагоджваць чужымі цукроўкамі.

— А ў мяне прыхаваны затвор і штых, — сказаў Сцёпа і згроб нашы прыпасы сабе ў кішэню. Перадасць усё брату Сяргею — мы ведалі гэта. Сяргею ішоў ужо, здаецца, семнаццаты год, і ў яго была свая таямніца.

Працяг у наступным нумары.

ЦЫРК



«Блакітны агеньчык» — так называецца новая праграма, якую паказвае Мінскі дзяржаўны цырк. Рэжысёры прадстаўлення — В. Арлоў і Г. Агаронаў. У разнастайнай і змястоўнай праграме сваё майстэрства паказваюць паветраныя гімнасты Крыленка, эквілібрысты на пераходнай лесвіцы Маркавы і Сафронаў, эксцэнтрыкі Палосін і Касацінаў. З цікавасцю сустракаюць гледачы велафігурыстаў пад кіраўніцтвам Аляксандрава. Вынаходліва зроблены нумар — эквілібр на п'едэстале (артыстка Яфрэмава).

Другое аддзяленне аддадзена джыгітам пад кіраўніцтвам Хаджабаева.

У паўзах выступаюць артысты Гусеў і Фероні.

На здымку — джыгіты Хаджабаевы.

Фота Ул. КРУКА.

СЯРЭБРАНЫ СВЕТ

ЗЗЯЕ гранямі сярэбраная паверхня чаканнага дрэўца з цяжкай кронай на прамым ствале. Круглае лісце сплялося ў шчыльны ўзор. На галінках пасуцца коні, авечкі, каровы. Вока не адразу бачыць у лістоце фігуркі жывёл, побач з якімі ўюць гнёзды птушкі, раскідаюць крылы лебедзі. Гэта традыцыйнае ў сусветным мастацтве дрэва жыцця работы бурацкіх майстроў-дарханаў. Іх мастацтва жывое і сёння. Адзін з яго прадстаўнікоў — выдатны майстар Сасор Санжэеў. Яму семдзесят гадоў. Жыве ён у старым драўляным доме ў улусе Паселье — прадмесце Улан-Удэ. У двары майстэрня, якую Санжэеў пабудаваў сам. Два пакоі. У першым земляная падлога, у другім з вузкіх нефарбаваных дошак.

Тут і нараджаюцца шэдэўры.

У пакоі з земляной падлогай — ля сцяны касцёр бярозавых дроў. На столі квадратная дзірка з навесам, пад ім старыя мяхі з белай, татуіраванай павуцінай маршчын скуры. Пад імі чыгун з распаленымі вуголлямі, у які ставіцца гліняная шклянка з нарэзаным серабром. Ідзе плаўка. Тонкімі абцугамі стары бярэ шклянку за край і разлівае вадкі метал у дзве выемкі на цагліне. А потым на маленькім кавадлачку майстар апрацоўвае астываючы кавалачак серабра.

Рабочы стол ля акна. У плоскіх круглых бляшаных скрыначках чаканы, як цвікі, хітраватыя інструменты, рознага памеру малаткі і малаточкі.

Імі ён выбівае, выцягвае аб'ём. З акна відаць, як наўскасяк, падымаецца самалёт, побач аэрадром — але шуму матораў не чуваць, чуваць стук малатка аб метал у майстэрні. На выбітую форму майстар лёгка наносіць узор.

З'яўляюцца дробныя дэталі, якія патрабуюць пайкі. Каля печы жароўня з вугалем на драўлянай падстаўцы з ручкай. Тлее кнот. На хаду, непрыкметна для вока, прыпайвае майстар маленечкія, апрацаваныя кавалачкі серабра. Сярэбраны пыл падае на адзенне майстра, густа кладзецца на стол. Стары збірае яго рукамі, як крошкі хлеба. Ён зноў будзе пераплаўлены.

Блішчаць акуляры ў светлай аправе. Напружаны позірк чорных вачэй, што бачаць рэч ужо такой, якой яна павінна быць.

І вось нарэшце на далоні толькі што зробленая булсурга — маленькі медальён-ладанка. Яна нібы ўзорная і незнаёмая кветка.

Свайму рамяству Сасор Санжэеў вучыць шаснаццацігадовага сына. Расказвае яму аб продках, аб бурацкай чаканцы, а вытокі яе бяруць пачатак у старажытнасці. Калісьці чаканка служыла універсальным сродкам упрыгожвання. Яшчэ да шаснаццатага стагоддзя адносяцца каваныя вырабы з насечкай і гравіроўкай, металічнымі бляшкамі на скураных рамнях. Упрыгожваліся арнаментам сёдлы, аброці.

Чаканка больш позняга часу — у асноўным рэльефная, вызначаецца манументальным рашэннем. Арнаменты — геаметрычныя, выразныя і мудрагелістыя — з нескладанай чатырохпаціпялёсткавай кветкай або вычварна-гарманічнымі сплященнямі, ляснымі нетрамі. Лакачічныя і дакладныя малюнкі звяроў па месяцах мангольскага календара, міфічных драконаў і птушак.

Народныя майстры не чарнілі серабра. Яно само цямнела ад часу, і паціна надавала старым рэчам натуральна-закончаны выгляд. З вялікім густам серабро ўпрыгожвалі караламі. Мова бурацкай чаканкі надзвычай простая, у ёй спалучаецца вытанчаная дэкаратыўнасць усходняга мастацтва са стыхійным выказваннем пачуццяў. Якраз гэтая асаблівасць дазваляе бурацкім майстрам захоўваць вечную наіўнасць і першароднасць творчасці — рэчы іх дыхаюць.

Па некалькі кілаграмаў сярэбраных чаканных упрыгожанняў навешвалі на сябе бурацкія жанчыны. На шапцы — дэнзэ з буйным каралам і дэкаратыўныя падвескі да плячэй. На грудзях медальён-булсурга. Косы ўбіралі ў сярэбраныя чахлы з караламі. Пацеркі да пояса з літай фігуркай ільва мелі некалькі падвесак на ланцужках ручной работы. Бакавыя ўпрыгожванні падвешвалі да пояса халата. На плячах мацаваліся асобныя ўпрыгожанні, таксама з серабра, падобныя на пагоны. Арыгінальныя былі пярсцёнкі — гэта кветка з рэльефнымі пялёсткамі або фігурка жабы, выразны арнамент або іерогліф.

Да пояса бураты таксама падвешвалі цэлы камплект упрыгожанняў. Цэнтр гэтай чаканнай кампазіцыі, злучанай ланцужкамі, — нож у багатай аправе і стальное крэсіва, якое мацавалася на скуры з сярэбранымі бляшкамі. З бірулькамі падвешвалася марская ракавіна.

Бурацкая чаканка шырока вядома. І сёння ўпрыгожанні, зробленыя нацыянальнымі майстрамі, карыстаюцца поспехам у жанчын. Рэчы побыту, медныя і латунныя збаны, акаймаваныя густымі палосамі чаканкі, упрыгожаныя кветкамі або міфічнымі драконамі і птушкамі, драўляныя піялы з кораня ільма або багуна; устаўленыя ў сярэбраную аправу з насечкай па краях, экспанаваліся на многіх выстаўках. Вырабы бурацкіх чаканшчыкаў прыцягвалі заўсёды ўвагу наведвальнікаў сваёй своеасаблівай чаканкай, якая нагадвае рэльеф бурацкай мясцовасці з яе буйнымі формамі і выразнымі лініямі.

Людміла АЛЗОЕВА.
(АДН).

АЗЕРБАЙДЖАНСКІ ВУЧОНЫ ПРА БЕЛАРУСКУЮ ЛІТАРАТУРУ

Летась у канцы года ў Азербайджане выйшла двухтомнае даследаванне «Літаратура народаў СССР» на азербайджанскай мове. Аўтар яго — дацэнт Азербайджанскага дзяржаўнага універсітэта Панах Халілаў паспрабаваў асвятліць гісторыю і развіццё братніх літаратур нашай краіны.

Вялікае месца ў даследаванні адведзена беларускай літаратуры. Нарыс пра яе складаецца з чатырох раздзелаў: фальклор, літаратура XVI—XVII стагоддзяў, літаратура XIX—XX стагоддзяў і савецкая беларуская літаратура.

Пасля кароткіх звестак пра гісторыю, этнаграфію і культуру беларускага народа аўтар знаёміць чытачоў з вуснай народнай творчасцю беларусаў, адзначаючы, што фальклор на Беларусі вельмі багаты і своеасаблівы.

У другім раздзеле П. Халілаў разглядае дзейнасць беларускага першадрукара Францішка Скарыны, а таксама літаратурную і грамадскую дзейнасць беларускіх асветнікаў і філосафаў Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Мялеція Смятрыцкага, Сімяона Полацкага.

Трэці раздзел пачынаецца з разгляду ананімных паэм «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Тут жа змешчаны нарысы пра жыццё і творчасць Дуніна-Марцінкевіча, Багушэвіча, Цёткі, Багдановіча. Творчасць Багушэвіча падаецца ў параўнанні з творчасцю азербайджанскага рэаліста Джаліла Мамедкулізадэ, які таксама, як і беларускі паэт, выступаў ад імя беднага і бяспраўнага народа. Беларускі мужык з верша «Дурны мужык, як варона», гаворыць аўтар, такі ж гаротнік, як і азербайджанскі селянін Наўрузалі з твораў Мамедкулізадэ.

Гаворачы пра вершы Янкі Лучыны, П. Халілаў заўважае, як цяжка было беларускаму народу ствараць сваю літаратуру да рэвалюцыі, калі даводзілася, у абыход царскай цэнзуры, выдаваць беларускія творы за балгарскія.

Раздзел пра беларускую савецкую літаратуру пачынаецца з нарысаў пра Янку Купалу і Якуба Коласа, творчасць якіх ведае і любіць азербайджанскі чытач. Гаворачы пра Якуба Коласа, аўтар прыгадвае выступленне Самеда Вургуна на другім з'ездзе пісьменнікаў СССР, у якім азербайджанскі пісьменнік, высока ацэньваючы эпічныя паэмы беларускага песняра, адзначаў, што і для іншых нацыянальных літаратур патрэбны такія ж шырокія паэтычныя рамаы, як «Новая зямля», «Сымон-музыка» і «Рыбакова хата».

У кнізе змешчаны таксама літаратурныя партрэты К. Чорнага, М. Лынькова, М. Танка, А. Куляшова, П. Броўкі, П. Глебкі. Многа цёплых слоў сказана ў кнізе пра творчасць П. Панчанкі, Я. Брыля, І. Шамякіна і іншых беларускіх пісьменнікаў.

В. АРЗУМАНАЎ.

г. Баку.



ЗІМОВАЯ ГРАФІКА.

Фотаэцюд А. ГЛІНСКАГА.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

7 лютага

Першая праграма 9-10 — *тэлебачанне — школе. Гісторыя.* 4-ы клас. «У. І. Ленін — заснавальнік Камуністычнай партыі». 9-40 — «Лясное возера». Кінанарыс. 10-00 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — для дзяцей. «Цуды прыроды». (М). 10-30 — «Па старонках музычных спектакляў» (М). 11-45 — выступленне музычнага ансамбля Дома культуры завода «Электрапрыбор» (М). 16-40 — праграма перадач. 16-45 — тэлевізійныя навіны (М). 17-00 — трыбуна прапагандыста. «Аб спадчыне вядомых прамоўцаў». Гутарка кандыдата філалагічных навук А. Міхневіча. 17-30 — «Панарама навін». 18-00 — «Абітурыент-69». «Стваральнікі друкаванага слова». 18-30 — «Подзвіг». Тэлевізійны альманах (М). 19-00 — Клуб аматараў песні» (М). 20-00 — «Эстафета навін» (М). 20-45 — «Абвінавачаны не з'явіўся». Мастацкі фільм. 22-00 — першынство Еўропы па фігурным катанні. Перадача з ФРГ. У перапынках — «Толькі факты». Праграма перадач.

Другая праграма 17-00 — канцэрт. Перадача з Вільнюса. 17-30 — «Шахматны альманах» (М). 18-00 — для малодшых школьнікаў. «Вясёлы гарадок» (М). 18-30 — экран — завочнікам. Марксісцка-ленінская філасофія. «Матэрыяльная вытворчасць — аснова грамадскага развіцця». Лекцыя кандыдата філасофскіх навук В. М. Панкратава. 19-00 — «Калі дрэвы былі вялікімі». Мастацкі фільм. 20-30 — рэклама, аб'явы. 20-45 — канцэрт сімфанічнага аркестра Грузінскага радыё і тэлебачання. Перадача з Тбілісі.

8 лютага

Першая праграма 8-25 — праграма перадач. 8-30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Супрацiўленне матэрыялаў». 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М) .9-45 — тэлевізійныя навіны (М). 10-00 — «Ранішняя вясёлая праграма» (М). 10-30 — «Чалавек і рэлігія». «Генерал у сутане». Тэлевізійны публіцыстычны нарыс (М). 11-00 — «Музычны турнір гарадоў» (М). 12-00 — яшчэ раз аб лыжах і клюшках». Вынікі рэйду Беларускага тэлебачання. 12-30 — «Хроніка музычнага жыцця рэспублікі. Год 1940-ы». 13-15 — «Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. 13-45 — «Музычная шкатулка». 14-00 — сельскі клуб «Колас». Трансляцыя на Маскву. 15-00 — праграма каляровага тэлебачання 1. Для дзяцей. «Змерзлая рабіна». Тэлевізійны спектакль. 2. «Лёс кедра». Навукова-папулярны кінанарыс. 3. «Ён і яна». Лірычны дуэт у балеце (М). 16-30 — «Навіны дня». Кіначасопіс (М). 16-45 — тэлевізійныя навіны (М). 17-00 — «Вецер вандраванняў». *Тэлевізійнае падарожжа.* 17-50 — «Па вашых просьбах». Я. Купала. «Паўлінка». Спектакль Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы. 20-00 — «Штрыхі да партрэта». Дакументальны фільм. 21-00 — першынство Еўропы па фігурным катанні. Перадача з ФРГ. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). Пасля заканчэння — «Толькі факты». Праграма перадач (М).

9 лютага

Першая праграма 8-25 — праграма перадач. 8-30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Электратэхніка». 9-00 — «На зарадку станавіся!» (М). 9-15 — тэлевізійныя навіны (М). 9-30 — «Будзільнік» (М). 10-00 — «Музычны кіёск» (М). 10-30 — «Графічныя байкі». Ілюстрацыі В. А. Сярова да баек І. А. Крылова (М). 11-00 — для юнацтва. «Паштовая скрынка алімпіяды». Адказы на пытанні І тура алімпіяды. «Навука перамагаць» (М). 12-00 — «Сельская гадзіна» (М). 13-00 — для школьнікаў. «Інтэрв'ю дае Баранкін». Аб вучнях 4-й музычнай школы Мінска. 13-40 — насустрач выбарам у мясцовыя Саветы БССР. «Тэлевізійны агітпункт». 13-55 — «Спявае Н. Багуслаўская. Канцэрт-нарыс. 14-30 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Шляхі бацькоў — дарогі сыноў» (М). 15-00 — «Маскоўскаму мастацкаму акадэмічнаму тэатру СССР імя М. Горкага — 70 гадоў» (М). 17-00 — «Клуб кінападарожнікаў» (М). 18-00 — першынство Еўропы па фігурным катанні. Перадача з ФРГ. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 20-00 — «Сем дзён». Міжнародная праграма (М) 20-45 — праграма каляровага тэлебачання. 1. Тэлевізійны тэатр мініяцюр. «Гумар на вешалцы». 2. «Першае каханне». Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма (М). 23-15 — «Спартыўны тыдзень» (М). 23-30 — праграма перадач.

ДЫПЛОМЫ І ГРАМАТЫ ПЕРАМОЖЦАМ

Мінскі абласны аргкамітэт па правядзенні агляду мастацкай самадзейнасці, прысвечанага 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі, падвёў вынікі творчага спаборніцтва народных талентаў Міншчыны.

За час агляду ў самадзейнасць вобласці прыйшло многа маладых аматараў мастацтва, было створана 320 новых калектываў. А ўсяго ў юбілейным аглядзе ўдзельнічала 3385 калектываў, якія аб'ядналі 55 тысяч чалавек. На раённых і абласной выстаўках самадзейнага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва свае работы паказвалі больш як 500 разьбяроў па дрэве, майстроў керамікі, скульптараў, жывапісцаў, ткачых, вышывальшчыц і інш.

За актыўны ўдзел у мастацкім абслугоўванні насельніцтва, за стварэнне цікавых высокаідэйных праграм і за дасягнутыя творчыя поспехі дыпломамі першай, другой і трэцяй ступені і заахвочвальнымі дыпломамі ўзнагароджаны больш як 250 спевакоў, музыкантаў, чытальнікаў, кампазітараў-аматараў, народных умельцаў і 248 самадзейных калектываў.

Сярод узнагароджаных дыпломамі І ступені — жаночы вакальны ансамбль «Лявоніха» саўгаса «Сцяг Кастрычніка» Бярэзінскага раёна (кіраўнік Г. Яфрэмаў), танцавальны калектыў Івянецкага гарадскога Дома культуры (кіраўнік І. Ляшчынскі), *Лебедзеўская народная харавая капэла* (кіраўнік А. Пыжык), Казловіцкі і Лявонавіцкі народныя хоры (кіраўнікі А. Даўжонак і С. Лагіновіч), аркестр дудароў Чэрвеньскага раённага Дома культуры (кіраўнікі І. Лычкоўскі і В. Кісялёў), дзіцячы *вакальны ансамбль* «Кацяняты» і хор настаўнікаў Салігорскай сярэдняй школы № 3 (кіраўнік А. Сідарэнка), народны мужчынскі хор Мінскага аўтазавода (кіраўнік М. Ільічоў), вакальны дуэт Палаца культуры трактарнага завода ў складзе Н. Калінінай і С. Шадзенка (кіраўнік Ю. Маляўка) і іншыя.

Дыпломамі І ступені ўзнагароджаны таксама самадзейныя кампазітары М. Кашуба, П. Касач, І. Троска, Я. Ціхановіч, В. Хахлоў, *чытальніца В. Ханцеева,* кіраўнік студыі выяўленчага мастацтва Барысаўскага гарадскога Дома культуры С. Мірзаян, разьбяры па дрэве Л. Шостак, А. Пупко, В. Фокін, самадзейны скульптар А. Жываеў, ткачыхі з Маладзечанскага раёна З. Карповіч, З. Кулянок і іншыя.

За паспяховае правядзенне раённых юбілейных аглядаў граматамі Мінскага абкома партыі і аблвыканкома ўзнагароджана 20 старшынь раённых аргкамітэтаў і сакратароў райкомаў партыі.

За поспехі ў развіцці самадзейнага мастацтва, цікавыя і змястоўныя тэматычныя праграмы пераходныя вымпелы абласнога аргкамітэта прысуджаны самадзейным калектывам Стаўбцоўскага раёна і горада Маладзечна.

ПАМАГАЮЦЬ САМАДЗЕЙНЫМ КАЛЕКТЫВАМ

Музычная школа ў Лёзна працуе ўжо 8 гадоў. За гэты час яе *закончылі* 42 чалавекі. Выхаванцы школы А. Бондараў, У. Ягораў, А. Зубенка, У. Самуйлаў, Т. Каралёва і іншыя працуюць цяпер у клубах раёна. Некаторыя выпускнікі вучацца ў музычных вучылішчах.

Летась адкрыўся новы клас цымбал, на які прынята 22 чалавекі.

Выкладчыкі школы актыўна памагаюць народнай філармоніі, *якая працуе пры раённым* Доме культуры, і іншым самадзейным калектывам. Педагог І. Глушанкова кіруе хорам пры раённай бальніцы, а дырэктар школы Л. Бараноўская — хорам і ансамблем раённага аб'яднання «Сельгастэхніка».

П. КАБАК.

МАЛЮЮЦЬ ДЗЕЦІ

«Мой горад, маё Палессе, мая Беларусь» — так назвалі ў Пінску выстаўку дзіцячага малюнка вучняў другой сярэдняй школы. Арыгінальнасць экспазіцыі, яркая маляўнічасць і непасрэднасць дзіцячых *уражанняў вельмі* вабяць і юных і дарослых гледачоў.

Многа акварэльных малюнкаў — пра будаўніцтва: «Будаўнікі камбіната верхняга трыкатажу», «Будуюць новы дом», «Новае Палессе», «Наш элеватар» і іншыя. Хвалюе дзяцей і гераізм савецкіх людзей у дні Вялікай Айчыннай вайны («Подзвіг Марата Казея», «На граніцы»), пейзажы роднага краю («Вечар у калгасе», «На былых балотах», «Прыпяць летам», «На палях маёй Радзімы»).

За месяц выстаўку, якую афарміў настаўнік малявання Анатоль Сяліцкі, наведала каля пяці тысяч чалавек.

У. БАРАВІКОЎ.

ФІЛЬМ ПРА РОДНЫ ЗАВОД

У зале гасне святло, і на экране глядач бачыць знаёмыя карпусы Светлагорскага завода штучнага валакна. Кінааб'ектыў захаваў нямала важных падзей з біяграфіі шматтысячнага рабочага калектыву.

Урачысты момант — атрымана першая катушка кордных нітак. Мітынг. Радасныя, усхваляваныя твары... Яшчэ адна важная падзея — камсамольцам завода ўручаецца Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР, якой іх арганізацыя ўзнагароджана за поспехі ў камуністычным выхаванні моладзі. А далей — святочная дэманстрацыя працоўных, прысвечаная 50-годдзю БССР і Кампартыі рэспублікі. Ідуць рабочыя, тэхнікі, інжынеры...

Больш года працуе над фільмам аб родным заводзе кіраўнік групы канструктарскага бюро Анатоль Канстанцінаў. Першымі гледачамі фрагментаў з гэтага фільма былі ўдзельнікі аб'яднанага семінара сакратароў цэхавых камсамольскіх арганізацый завода штучнага валакна.

І. КАТЛЯРОЎ.

ГАДЗІННІКІ МАСКВЫ

СЯРОД ззяючых каштоўнасцямі вітрын Аружэйнай палаты Маскоўскага Крамля вылучаецца *адна, запоўненая* настольнымі і кішэннымі гадзіннікамі работы рускіх і замежных майстроў XVI—XIX стагоддзяў.

Гадзіннік у выглядзе пазалочанай трыумфальнай калясніцы, запрэжанай сланом; гадзіннік — вершнік на кані. Гадзіннік, падобны на кніжачку — ён належаў Івану Грознаму. *Гадзіннікі ў сярэбранай* аправе ў форме цыбулін — уласнасць патрыярхаў Русі — Філарэта і Нікана. Гадзіннік, устаўлены ў сцізорык, — з Іспаніі, у выглядзе музычнай табакеркі — з Лондана, з некалькімі цыферблатамі фірмы «Брэгет» — з Францыі.

Асабліва цікавыя экземпляры, зробленыя ў Расіі. Вось невялікі *кішэнны гадзіннік,* зроблены ледзь не паўтары сотні гадоў назад. Ён не залаты, не сярэбраны. Яго не ўпрыгожваюць каштоўныя камяні або мудрагелістыя малюнкі. Але якраз гэтым гадзіннікам зацікавіўся фрэзероўшчык Маскоўскага другога гадзіннікавага завода Барыс Радчанка, які з захапленнем займаецца вывучэннем гісторыі развіцця гадзіннікавай вытворчасці ў Расіі.

Вядома, што ў Швейцарыі гадзіннікавай вытворчасцю займаюцца ўжо каля чатырохсот гадоў, у Францыі яна нарадзілася пяць стагоддзяў назад. А калі з'явіўся першы гадзіннік у Расіі? Барыс Радчанка звярнуўся да архіваў, заняўся пошукам матэрыялаў аб рускіх умельцах, у час адпачынкаў наведваў далёкія куткі краіны. І пошук прынёс поспех.

...У пачатку мінулага стагоддзя ў глухой вёсачцы каля ракі Вяткі жылі майстры, якія славіліся разьбой па дрэве. Больш за ўсіх паважалі землякі старэйшага ўмельца Сямёна Броннікава. Аднойчы прыехаў у вёсачку прыказчык з горада, заглянуў у хату да Броннікавых.

— А што, Сямён, — звярнуўся ён да майстра. — Бачыў такі цуд? І паказаў яму залаты гадзіннік на залатым ланцужку з падвескамі.

Пстрыкнуў прыказчык адным вечкам — адкрыліся палачкі на кружочку з лічбамі. Пстрыкнуў другім — зайгралі на сонцы пазалочаныя калёсікі. Такога дзіва ў вёсцы яшчэ ніхто не бачыў.

Майстар у той раз доўга ўглядаўся ў заморскі цуд, а потым шэсць гадоў, крадком ад усіх, майстраваў свой гадзіннік. І вось, нарэшце, ён гатовы. Маленькі. Дыяметрам усяго ў тры сантыметры. Корпус і футляр — з цвёрдага бярозавага наростка — капа. Механізм, цыферблат і ланцужок — з пальмы, стрэлкі — з бружмелю, валасок — з найтанейшых ніцей загартаванага бамбука. Карацей: гадзіннік Броннікава цалкам драўляны.

У 1837 годзе ў Вятцы адкрылася *губерanская гандлёва-прамысловая* выстаўка. Па яе справах клапаціўся, у прыватнасці, сасланы ў гэты горад Аляксандр Герцэн. Ён то і дабіўся, каб гадзіннік выдатнага ўмельца экспанаваўся на выстаўцы. Здарылася так, што ў Вятку прыехаў *наследнік рускага пра*стола, будучы цар Аляксандр II. Яму паказалі дзівосны гадзіннік, і ён перайшоў у яго ўласнасць.

У сям'і ўмельцаў Броннікавых змайстравалі каля двух дзесяткаў драўляных гадзіннікаў. У СССР захавалася з іх толькі дванаццаць экземпляраў. Пяць гадзіннікаў захоўваюцца на радзіме іх стваральнікаў, у Кіраўскім абласным краязнаўчым музеі, па адным экземпляры ў Навукова-даследчым інстытуце гадзіннікавай прамысловасці СССР, у Музеі народнай творчасці Грузіі, Музеі народнага мастацтва (Масква) і, нарэшце, яшчэ адзін — той самы першы — у Аружэйнай палаце Крамля.

Такая гісторыя драўляных гадзіннікаў, якая прыцягнула ўвагу фрэзероўшчыка гадзіннікавага завода. Але Радчанка зацікавіўся і іншымі гадзіннікамі, якія прадстаўлены ў унікальнай крамлёўскай калекцыі. Каля двух гадоў ён прысвяціў пошуку дакументаў, архіўных дадзеных аб кожным рэдкім экземпляры. У выніку яго пошукаў на свет з'явілася кніжка «Гадзіннікі Масквы».

У кнізе расказана не толькі гісторыя гадзіннікаў Броннікавых, але і прасочана паходжанне іншых гадзіннікаў, якія з'явіліся ў Расіі значна раней. З цікавасцю чытаюцца раздзелы, прысвечаныя першаму «механічнаму» гадзінніку на вежы Крамля, устаноўленаму яшчэ ў пачатку XV стагоддзя, *гадзіннікам Пятра Першага і Івана* Грознага.

З вялікай любоўю расказана аб гадзінніку, вядомым цяпер усяму свету. Гутарка ідзе аб кішэнным гадзінніку Уладзіміра Ільіча, які экспануецца ў Цэнтральным музеі У. І. Леніна ў Маскве.

Кніга «Гадзіннікі Масквы» — сапраўды даследчая праца, якая патрабавала грунтоўных гістарычных ведаў. І цікава, што гэтую працу так паспяхова выканаў не прафесіянал-гісторык, а аматар-рабочы.

Радчанка — удзельнік другой сусветнай вайны, разам з савецкімі *войскамі дайшоў да Берліна.* У 1960 годзе яго прынялі ў Саюз журналістаў. Рабочы-фрэзероўшчык з'яўляецца аўтарам раду артыкулаў і нарысаў, апублікаваных у маскоўскіх газетах. Але завод, дзе ён працуе, вось ужо два дзесяціголддзі для яго па-ранейшаму — галоўная справа яго жыцця.

Яўгеній ЛЯОНЦЬЕЎ.
(АДН).

ГУМАР нашых сяброў

Януш АСЭНКА

ПАЖАР, ПАЖАР!

Дзеючыя асобы: Гаспадар кватэры — Г., Пажарнік — П.

П. Гэта вуліца Селянкова, 32, кватэра 16?

Г. Так.

П. Нам пазванілі, што ў вас *пажар.*

Г. Гэта памылка, ніякага тут пажару няма.

П. Нам паведамілі па тэлефоне, што ў вас пажар.

Г. Ды што вы, я ж тут жыву.

П. А ў мяне напісана: Селянкова, 32, кватэра 16. Памылкі быць не можа, пажар павінен быць.

Г. Але што зробіш, няма пажару. Тут нейкае непаразуменне.

П. Ах, непаразуменне? А ваш тэлефон — 213-465?

Г. Так, гэта мой тэлефон.

П. Значыць усё ў парадку. Пажар ёсць.

Г. Няма ніякага пажару. Я ж бы ведаў! Можа гэта дарэмная трывога?

П. Дарэмная трывога? Значыць, вы пазванілі ў пажарную каманду проста так, для смеху? А вы ведаеце, што за гэта можа быць?

Г. Клянуся, я не званіў. Можа дзеці, калі мяне дома не было...

П. Нам усё роўна, хто званіў. Калі трывога сапраўды дарэмная, не хацеў бы я быць на вашым месцы. Пракуроры аж шалеюць ад такіх спраў. Вам з турмы не вылезці.

Г. Што ж рабіць? Хоць бы якая-небудзь іскрынка, а тут як на зло ўсё ў парадку. Зразумейце маё становішча.

П. Я вам раю займець пажарчык. З пракурорам жарты дрэнныя.

Г. Так, але як яго зрабіць.

П. Гэта ўжо не мая справа. Я пажары толькі тушу.

Г. Пачакайце адну хвілінку, я загляну ў другі пакой. Там у мяне маленькая бутэлечка з бензінам.

П. Паспяшайцеся. Мы і так ужо страцілі многа часу. *(Гаспадар выходзіць, праз хвіліну вяртаецца).*


Г. Гарыць! Пажар у спальні. Гарыць падлога, коўдра і фіранка.

П. (заглядвае). Сапраўды, гарыць. Ну, цяпер усё ў парадку. Што ж, падлога гарыць даволі прыстойна, ды і коўдра з фіранкай нядрэнна.

Г. Чаго ж вы глядзіце? Чаму не тушыце?

П. Што? Тушыць? Не будзеце дарэмна выклікаць пажарнікаў! У вас была дарэмная трывога, а я не сапраўдны пажарнік! Цяпер тушыце самі.

Пераклад з польскай мовы.



— Новая п'еса нічога не варта!

— Ты глядзеў яе?

— Не, я абрабаваў іх касу...

(Карыкатура Ганча Раева з балгарскага часопіса «Тэатр»).

ДЫЯЛОГІ

Сын пытаецца ў бацькі:

— Тата, нежанаты мужчына завецца хлопцам?

— Ага.

— А як завецца жанаты мужчына?

— Ты яшчэ занадта малы, каб ведаць такія рэчы.

□ □ □

— Гэта праўда, што ты ўчора развялася?

— Праўда.

— А хто той шчаслівчык?

□ □ □

Папугай, які застаўся адзін дома, адчуў сябе блага і вырашыў звярнуцца да ветэрынара. Ён зняў тэлефонную трубку і дзюбай набраў патрэбны нумар:

— Я хацеў бы пагаварыць з доктарам...

— Яго няма дома.

— А хто гэта гаворыць?

— Яго папугай.

□ □ □

Дзве жанчыны ўважліва разглядаюць торт, які спякла іх сяброўка на свой дзень нараджэння.

— Што гэта! — здзіўляецца адна з іх. — У торце ўсяго дваццаць свечак!

— Відаць, іх будуць запальваць з двух канцоў.

□ □ □

Адзін хлопец кажа другому:

— З таго часу, як дзяўчаты пачалі насіць міні-спадніцы, я зразумеў, чаму яны раней так старанна хавалі свае ногі.

Пераклаў з сербскай А. САМАСЕЙКА.

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Дазвольце праз вашу газету сардэчна падзякаваць усім установам, сябрам, таварышам, якія павіншавалі мяне ў сувязі з прысваеннем мне ганаровага звання заслужанага дзеяча культуры БССР.

Пiлiп ПЕСТРАК.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры, вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 03580